Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№141 (28505)

26 ЛІПЕНЯ 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 5–12

**Вёска, дзе гадуюць чэмпіёнаў**

МС

**Як «Звязда» развозіла пошту**

СТАР. 4

**Калі звяртаюцца да сямейных псіхатэрапеўтаў**

СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Сяргей РАЎНЕЙКА, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці:**

*«Выязным прыёмам грамадзян у Адміністрацыі Прэзідэнта ўдзяляецца павышаная ўвага. Такая форма зносін запатрабавана насельніцтвам, але таксама неабходна і нам, прадстаўнікам улады: мы павінны чуць людзей. Усе пытанні, якія хвалююць грамадзян, знаходзяцца на асаблівым кантролі. У Гродзенскім рэгіёне больш за палову пытанняў, якія паступілі падчас нядаўніх падобных прыёмаў, ужо зняты».*

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 26.07.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9458 ▲ |
| Еўра | 2,2665 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0325 ■ |
| Укр. грыўня | 0,0753 ■ |

ISSN 1990 - 763X

# Рамонкавае сэлфі

Маргарыта і Ян МЕСНІКІ з вёскі Заеліца Глускага раёна.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Спадчына

## ЗАМАК НА ПЕРАДАВОЙ

За сто гадоў пасля Першай сусветнай вайны Крэўскі замак амаль не змяніўся, але калі своечасова не прыняць меры, ён можа знікнуць назаўсёды

**Пабудаваны ў пачатку XIV (а па некаторых крыніцах, у канцы XIII) стагоддзя, ён быў сведкам ключавых падзей у гісторыі не толькі нашай краіны, а цэлай Еўропы. За сем стагоддзяў існавання Крэўскі замак не аднойчы станавіўся арэнай барацьбы за ўладу. Тут вырашаўся лёс дзяржаў, аб'ядноўваліся вядомыя каралеўскія дынастыі. Адно са старэйшых абарончых збудаванняў на тэрыторыі Беларусі бралі ў асаду мяцежныя князі, маскоўскія ваяводы, перакопскія татары...**

Але найбольш Крэўскі замак пацярпеў у гады Першай сусветнай вайны. Амаль два з паловай гады — з верасня 1915-га па люты 1918 года — праз яго праходзіла лінія фронту. Воіны Рускай імператарскай арміі старажытныя сцены не шкадавалі: з'яўляючыся часткай нямецкай сістэмы абароны, Крэўскі замак не выстаяў пад магутным агнём артылерыі.

СТАР. 3

Від з нямецкіх пазіцый на Траецкую царкву і Княжаскую вежу Крэўскага замка. Зіма 1915—1916 гадоў.

■ Прыёмная кампанія — 2017

## Матэматыка ўмацоўвае свае пазіцыі

На некаторыя спецыяльнасці прахадныя балы выраслі на 50—80 пунктаў

**Беларускія ВНУ на гэтым тыдні завяршаюць залічэнне на бюджэтную форму навучання. У некаторых вышэйшых навучальных установах, дзе абітурыенты паступалі толькі па выніках ЦТ, ужо нават абвясцілі імёны будучых першакурснікаў. Але, напрыклад, у творчых ВНУ да 26 ліпеня яшчэ працягваюцца ўступныя выпрабаванні па профільных дысцыплінах.**

### У БДУ «РУЛІЦЬ «МІЖНАРОДНАЕ ПРАВА»

У Белдзяржуніверсітэце гэтымі днямі адбываецца адкрытае залічэнне на першы курс. Новыя рэкорды сёлета ўстанавілі абітурыенты, якія паступалі на факультэт міжнародных адносін (ФМА). Так, на спецыяльнасцях «міжнароднае права» і «міжнародныя адносіны» прахадны бал склаў 384, на спецыяльнасці «лінгвакраіназнаўства» — 381.

Не сталі нечаканасцю і вельмі высокія балы на спецыяльнасцях эканамічнага профілю: «сусветная эканоміка» — 371, «менеджмент» (кірунак — менеджмент у сферы міжнароднага турызму) — 366, «мытная справа» — 359, «менеджмент» (кірунак «міжнародны менеджмент, інавацыйны менеджмент») — 367, «эканамічная інфарматыка»— 364, «фінансы і крэдыт» — 356, «эканоміка»— 353, «эканамічная тэорыя» — 343.

СТАР. 2

Да 100-годдзя «Звязды» засталося 14 дзён

**На ўсе 100!!!**

**«Звязда» запрашае вас, шаноўныя чытачы, вашых блізкіх і сяброў на спартыўнае свята, якое адбудзецца ў суботу, 29 ліпеня, на спартыўнай пляцоўцы сталічнага Ліцэя №1 (праспект Газеты «Звязда», 6А).**

**Пачатак у 11.00. УВАХОД ВОЛЬНЫ.**

**Падрабязнасці на нашым сайце www.zviazda.by**

# ДЛЯ ЎСЯГО СВЕТУ

## Айчынныя трактары будуць удасканальвацца — у тым ліку і ў экспартных мэтах

**У савецкія часы Беларусь была прамысловым цэнтрам, дзе выраблялася вядомая ва ўсім свеце тэхніка. Так, мадэль трактара з Мінскага трактарнага завода нават знайшла сваё ўвасабленне на грашовай банкноце В'етнама! Дзяржава, нягледзячы на эканамічныя цяжкасці 90-х, змагла захаваць заводы па вытворчасці сельскагаспадарчых машын, і цяпер, як і дзясяткі гадоў таму, наша тэхніка ездзіць па розных кантынентах. Аднак сітуацыя на рынках становіцца ўсё больш складанай, і важна як захаваць старых партнёраў, так і набыць новых. Перспектывы развіцця айчыннага трактарабудавання і стварэння новых мадэляў трактароў абмеркавалі ўчора ў Палацы Незалежнасці.**

— Мне няма неабходнасці казаць пра значэнне гэтай галіны для Беларусі, — падкрэсліў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. — Яна закранае інтарэсы не толькі рэгіёнаў нашай краіны, але і ў цэлым усёй дзяржавы. Для сумежных прамысловых прадпрыемстваў гэта даволі важна, лакаматыў іх развіцця. Ад становішча спраў у сельскагаспадарчым машынабудаванні ў многім залежыць работа ўсяго сельскагаспадарчага комплексу, эканомікі сельскай гаспадаркі. Гэта, натуральна, адбіваецца і на сацыяльнай сферы.

Урад унёс на разгляд Прэзідэнта прапановы наконт выпуску на базе «Амкадора» новых відаў трактароў у рамках ствараемага холдынгу па вытворчасці сельскагаспадарчых машын. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што адпаведныя пытанні ўзнімаліся ўжо неаднойчы:

— Мая пазіцыя вам вядома. Меркаванні зацікаўленых бакоў, на жаль, разыходзяцца. Урад настойвае на рэалізацыі ўказанага праекта. Адсутнасць адзіных падыходаў развіцця трактарабудавання выклікае сур'ёзныя асцярогі. Таму ўзнікае пытанне: калі нехта на нечым настойвае, няхай растлумачыць і дакажа, што гэта той шлях, па якім мы павінны прайсці.

Мэта нарады — абмеркаваць прапановы і прыняць рашэнні, якія дазволяць выйсці нашым прадпрыемствам на больш высокі ўзровень, стварыць новыя канкурэнтаздольныя віды сельскагаспадарчых машын. Аляксандр Лукашэнка агучыў, на якія пытанні яму хацелася б пачуць адказы:

— Па-першае, якой бачыць урад стратэгію развіцця трактарабудавання? Бо прыватныя пытанні ў развіцці таго ці іншага віду трактароў, нават тых, што, магчыма, запатрабаваны на міжнародных рынках, на ўнутраным рынку, нельга прымаць без агульнай канцэпцыі. Па-другое, якая сёння эканамічная сітуацыя на «Амкадоры» і МТЗ? У чым сутнасць прапановы аб стварэнні холдынга па вытворчасці сельскагаспадарчых машын, ці ўзаемазвязана яна з дзеючымі ў краіне вытворчасцямі?

Галоўнае пытанне, агучанае кіраўніком дзяржавы: ці трэба нам браць за стварэнне новых тыпаў трактароў?

— Калі так, то на якой базе іх развіваць? — удакладніў Прэзідэнт. — На базе школы трактарабудавання, якая ёсць, або ствараць новую школу? Хоць на «Амкадоры» ёсць асобныя элементы падобнага вопыту.

Так, распрацоўка новых мадэляў і выпуск новых трактароў павінны павялічыць нашы экспартныя пастаўкі сельскагаспадарчай тэхнікі. Кааперацыя ж «Амкадора» і МТЗ дасць магчымасць абодвум прадпрыемствам абменьвацца перадавым вопытам.

Пры гэтым, як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, трэба мець на ўвазе, што нездаровая канкурэнцыя краіне не патрэбна.

— Больш за тое, не хацелася б нездаровага ператоку кадраў з аднаго прадпрыемства на другое, — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

У той жа час Прэзідэнт станоўча ацаніў той факт, што ўрад прадставіў праект па развіцці трактарабудавання менавіта з разлікам на кітайскія крэдыты:

— Тое, што нарэшце ўрад пачынае прапаноўваць праекты, як я разумею, па кітайскіх крэдытах, звязаных з матэрыяльнай вытворчасцю, — гэта ўжо добра. Таму што матэрыяльная вытворчасць дае аддачу, прыбытак і акупнасць крэдытаў. У адваротным выпадку мы ўсе гэтыя крэдыты можам пакласці на бюджэт і потым надарвацца: яны акажуцца непад'ёмнымі для нашага бюджэту.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

### У тэму

**Віталь ВОЎК, міністр прамысловасці Беларусі,** у размове з журналістамі паведаміў:

— Трактарабудаванне ў Рэспубліцы Беларусь будзе развівацца. У нас будзе і калёсны трактар, і гусенічны, і шарнірна-сучленены, і гідрафікаваны — гэта значыць, уся лінейка трактароў, якая сёння ёсць у свеце і якая карыстаецца попытам на пэўных рынках. Гэта галоўная задача: мы сёння пашыраем наменклатуру трактарнай тэхнікі для таго, каб павысіць экспартны патэнцыял краіны і нарэшце забяспечыць унутраны рынак.

Міністр прамысловасці запэўніў: рынак ёсць — як унутры краіны, так і ў свеце. І тую нішу, якую мы маем ужо цяпер, трэба пашыраць. Падмурак для гэтага маецца.

Што да прамысловай вытворчасці трактароў на базе «Амкадора», то яна будзе запушчана тады, калі тэхніка пройдзе выпрабаванні.

— Думаю, на працягу года-двух мы ўбачым ужо прамысловую вытворчасць, — лічыць Віталь Воўк. — Да гэтага будуць вопытна-прамысловыя партыі. Эксплуатацыя пачнецца раней — можа нават у наступным годзе.

# Матэматыка ўмацоўвае свае пазіцыі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На юрыдычным факультэце самы высокі прахадны бал (368) быў зафіксаваны на спецыяльнасці «эканамічнае права». Мяжа пасунулася на 9 пунктаў у параўнанні з папярэднім годам.

Сур'ёзная канкурэнцыя назіралася сёлета таксама і на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, дзе адбыўся істотны рост прахадных балаў. Да таго ж без экзаменаў сюды былі залічаны 26 чалавек (гэта пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд). Прахадныя балы па асобных спецыяльнасцях размеркаваліся наступным чынам: «прыкладная інфарматыка» (кірунак — «праграмнае забеспячэнне камп'ютарных сістэм») — 372 (летась быў 364), «інфарматыка» — 360 (летась — 349), «актуарная матэматыка» — 352 (было 338), «камп'ютарная бяспека» (кірунак — «матэматычныя метады і праграмныя сістэмы») — 352 (быў 335), «прыкладная матэматыка» — 341 (было 305), «эканамічная кібернетыка» — 335 (было 302).

Адказны сакратар прыёмнай камісіі БДУ Вячаслаў Малафееў прагназаваў, што на некаторых спецыяльнасцях прахадныя балы ўзрастуць на 30—50 пунктаў, і не памыліўся. Так, на спецыяльнасць «радыёфізіка» прахаднымі сталі 295 балаў, а ў папярэднім годзе — 241; на спецыяльнасці «аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі» — 290 (быў 252); «фізічная электроніка» — 284 (быў 232); «камп'ютарная бяспека» (кірунак — «радыёфізічныя метады і праграмна-тэхнічныя сродкі») — 317 (быў 288); «прыкладная інфарматыка» (кірунак — «інфармацыйныя тэхналогіі тэлекамунікацыйных сістэм») — 309 (быў 278).

Але лідарам па прыросце прахадных балаў стаў механіка-матэматычны факультэт. На асобныя спецыяльнасці прахадныя балы тут склалі: «матэматыка» (кірунак — «навукова-вытворчая дзейнасць») — 321 (у 2016 годзе — 260); «матэматыка» (кірунак — «навукова-канструктарская дзейнасць») — 314 (у 2016 годзе — 241); «механіка і матэматычнае мадэляванне» — 293 (у 2016 годзе — 218); «матэматыка» (кірунак — «навукова-педагагічная дзейнасць») — 290 (у 2016 годзе — 214).

## БДПУ ПРАЦУЕ НАД ЯКАСЦЮ

У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце пасяджэнне прыёмнай камісіі па залічэнні на бюджэтную форму навучання адбудзецца 28 ліпеня. Але ўжо сёння ў прыёмнай камісіі ўніверсітэта кажуць аб паспяховасці прыёмнай кампаніі бягучага года.

Усяго ва ўніверсітэт было пададзена 3045 заяў, або амаль на 400 заяў больш, чым у 2016 годзе. Пры плане прыёму на дзённую бюджэтную форму навучання ў 800 месцаў сярэдні конкурс па ўніверсітэце складае больш за 2 чалавекі на месца, а на асобныя спецыяльнасці ён перавышае 10 чалавек на месца. Школьных медалістаў альбо ўладальнікаў дыплома ССНУ з адзнакай сярод абітурыентаў 171, выпускнікоў ліцэяў і гімназій — каля 300 чалавек.

— Значны рост прахадных балаў назіраецца практычна на ўсіх педагагічных спецыяльнасцях у нашым універсітэце, — каментуе **адказны сакратар прыёмнай камісіі БДПУ Сяргей ЯКАВЕНКА.** — На некаторых ён складае 50—80 пунктаў. На 80% спецыяльнасцяў будуць залічаны абітурыенты, якія набралі не менш як 250 балаў. На шэрагу спецыяльнасцяў прахадны бал перавысіць адзнаку ў 330.

На факультэтах: філалагічным, фізічнага выхавання, а таксама эстэтычнай адукацыі яшчэ праходзяць унутраныя выпрабаванні. Але ўжо зараз можна казаць пра тое, што прахадны бал на некаторых спецыяльнасцях гэтых факультэтаў будзе не ніжэй за 300.

Прыёмная кампанія 2017 года адметная яшчэ і тым, што ўпершыню ва ўніверсітэт паступаюць выпускнікі профільных педагагічных класаў. На працягу двух гадоў яны асвойвалі факультатыў «Уводзіны ў педагагічную прафесію», спрабавалі сябе ў ролі педагогаў, працуючы з малодшымі школьнікамі.

Сёлета падалі заявы ў БДПУ і паспяхова прайшлі гутаркі без прад'яўлення сертыфікатаў ЦТ 107 выпускнікоў педагагічных класаў. 20 працэнтаў з іх скончылі ліцэі і гімназіі.

— Сярэдні бал атэстата ў гэтай катэгорыі нашых абітурыентаў ад 9 і вышэйшы. Па профільных прадметах яны павінны былі мець адзнаку ў атэстаце не менш як 8 балаў. Многія з іх з'яўляюцца пераможцамі алімпіяд і конкурсаў, займаюцца грамадскай дзейнасцю. Гэта добра падрыхтаваныя і матываваныя абітурыенты, якія ўжо са школы рыхтаваліся стаць настаўнікамі, — падкрэслівае з задавальненнем Сяргей Якавенка.

## А РАПТАМ ПАШАНЦУЕ?

І ўсё ж такі прасочваюцца сёлета і даволі сумныя тэндэнцыі, калі на вышэйшую адукацыю, прычым на бюджэтную форму навучання, прэтэндуюць і абітурыенты з вельмі нізкімі баламі. Інакш як яшчэ можна растлумачыць той факт, што свае дакументы заўляюць у прыёмныя камісіі маладыя людзі, якія маюць у суме за тры сертыфікаты плюс сярэдні бал атэстата, менш як 100 балаў? Для прыкладу, у Ваеннай акадэміі з такімі баламі абітурыенты спадзяюцца паступіць на спецыяльнасці «кіраванне мотастралковымі падраздзяленнямі» і «кіраванне танкавымі падраздзяленнямі». У Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце на «лясную гаспадарку» падалі свае дакументы 8 чалавек, якія маюць менш як 100 балаў, на спецыяльнасць «тэхналогія электрахімічных вытворчасцяў» — 2 чалавекі з такімі ж «бліскучымі» сертыфікатамі. Абітурыент, які мае менш як 110 балаў, марыць паступіць у БДТУ на «паліграфічнае абсталяванне і сістэмы апрацоўкі інфармацыі», а абітурыент, які не дацягнуў да 130 балаў, замахнуўся «на эканоміку і кіраванне прадпрыемствам». Гэта пры тым, што на 22 бюджэтныя месцы на гэтай спецыяльнасці прэтэндуюць 83 чалавекі.

Вельмі нізкія прахадныя балы назіраюцца на шэрагу спецыяльнасцяў у Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце: «канструяванне і тэхналогія вырабаў са скуры» — 130, «аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў і вытворчасцяў» — 145, «вытворчасць тэкстыльных матэрыялаў» — 122, «вытворчасць вырабаў на аснове трохмерных тэхналогій» — 163. Затое патрэбы ў дадатковым наборы тут сёлета няма. Не без праблем, але ўсе бюджэтныя месцы запоўніліся.

Наступны этап прыёмнай кампаніі — падача дакументаў на платную форму навучання. Тэрміны залічэння ў ВНУ сілавых ведамстваў на платную форму навучання — па 2 жніўня, у творчых ВНУ — па 3 жніўня, у сельскагаспадарчых і іншых ВНУ — па 6 жніўня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Ва ўрадзе

# Разабрацца з праблемамі на месцы

**Выязное пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў адбылося ўчора ў Барысаве. Дэлегацыя на чале з прэм'ер-міністрам Андрэем КАБЯКОВЫМ наведала буйныя прадпрыемствы Барысаўскага раёна, а таксама разгледзела шэраг найбольш праблемных пытанняў. Прадстаўнікі міністэрстваў азнаёміліся з ходам рэалізацыі інвестыцыйнага праекта па зборцы легкавых аўтамабіляў «БЕЛДЖЫ». Таксама не абышлі бокам рэканструкцыю ампульнай вытворчасці на хрустальным заводзе і праект па інвеставанні ў развіццё завода «Аўтагідраўзмацняльнік».**

Як адзначыў прэм'ер-міністр, падобныя паездкі не з'яўляюцца чымсьці незвычайным. «Кіраўнік дзяржавы паставіў задачы ўраду прыняць неабходныя меры па развіцці буйных рэгіянальных цэнтраў накшталт Оршы, Барысава, Баранавіч, Бабруйска. Мы вызначылі для сябе такі фармат работы, пры якім вывучаем праблемы на месцах падчас выязных пасяджэнняў, што лічым найбольш комплексным падыходам», — растлумачыў Андрэй Кабякоў.

Паводле яго слоў, Барысаўскі раён мае вялікі патэнцыял, які не задзейнічаны ў поўнай меры ў эканамічным развіцці. Пры гэтым ён з'яўляецца адным з цэнтраў развіцця Мінскай вобласці. Рэгіён — найбуйнейшы транспартны вузел з развітой сацыяльнай інфраструктурай. На тэрыторыі раёна працуе 40 прамысловых прадпрыемстваў. Яго доля ў абласным аб'ёме прамысловай вытворчасці за пяць месяцаў сёлета складае 10,9%. Сярод раёнаў Мінскай вобласці па гэтым паказчыку ён займае 3-е месца. Таксама рэгіён займае 3-е месца па знешнегандлёвым абароце.

Менавіта тут будуецца завод па зборцы легкавых аўтамабіляў «Geely». Перад прадпрыемствам стаяць амбіцыйныя задачы па вытворчасці 60 тысяч адзінак тэхнікі ў год і пастаўцы 90% прадукцыі на расійскі рынак. Варта адзначыць, што пры запуску ўзровень лакалізацыі вытворчасці складзе 14%. Спецыялісты адзначаюць, што да лістапада яны збяруць рухавік на Барысаўскім заводзе аўтатрактарнага электраабсталявання, які дазволіць давесці ўзровень лакалізацыі да 30%. З такой умовай аўтамабілі бесперашкодна змогуць прадавацца на тэрыторыі ЕАЭС.

**Міністр эканомікі Уладзімір ЗІНОЎСКІ** падкрэсліў, што ёсць шэраг раёнаў у краіне, якія патрабуюць да сябе сур'ёзнай увагі. «На жаль, нашы міністэрствы ўдзяляюць асаблівую ўвагу толькі тым прадпрыемствам, якія займаюць галоўнае месца ў холдынгах. Важна, каб міністэрства прамысловасці, канцэрны, аблвыканкамы аднолькава глядзелі на ўсе прадпрыемствы. Гэта дапаможа разабрацца ў сутнасці справы і аказаць неабходную дапамогу. Урад праводзіць другое такое пасяджэнне для эфектыўнага прыняцця неабходных рашэнняў па павышэнні канкурэнтаздольнасці прадпрыемстваў і для развіцця малога і сярэдняга бізнесу. Акрамя таго, сёння пастаўлена задача забяспечыць поўную занятасць насельніцтва. Для гэтага трэба ацаніць з пункту гледжання бізнес-планавання шэраг прадпрыемстваў», — лічыць міністр эканомікі.

Уладзімір Зіноўскі падзяляе меркаванне **намесніка старшыні Барысаўскага райвыканкама Леаніда ВАРОНІЧА** ў пытанні перспектыўнасці прадпрыемства «Аўтагідраўзмацняльнік». Сёння яно мае патрэбу ў пераўзбраенні, для чаго распрацаваны інвестыцыйны праект.

**Генеральны дырэктар барысаўскага завода «Аўтагідраўзмацняльнік» Васіль ЛАЎНІК** адзначыў, што згодна з інвестыцыйным праектам заводу патрэбна сума ў 34 млн долараў. «Праект разлічаны на тры этапы рэалізацыі. Ён прадугледжвае захаванне рынкаў збыту нашай прадукцыі. Сёння завод з'яўляецца адзіным вытворцам сістэм рулявога кіравання для вялікагрузных аўтамабіляў і аўтобусаў на постсавецкай прасторы. Мы цалкам камплектуем нашымі сістэмамі КамАЗ, ГАЗ, ПАЗ і шэраг іншых вядомых прадпрыемстваў. Сёння на гэтых прадпрыемствах распрацоўваюцца новыя віды аўтатэхнікі, якія патрабуюць новыя сістэмы ад нас. Таму мадэрнізацыя і стварэнне новых распрацовак цяпер як ніколі важныя», — растлумачыў Васіль Лаўнік.

Сродкі на закупку новага абсталявання збіраюцца знайсці ў інавацыйным фондзе Міністэрства прамысловасці і аблвыканкаме. Пры гэтым Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што грошы павінны выдзяляцца рацыянальна. «Трэба разумна ствараць прадукцыю з максімальным эфектам імпартазамяшчэння і выкарыстоўваць кааперацыйны падыход, калі шэраг камплектуючых будзе стварацца на магутнасцях іншых заводаў, каб не ўкладваць грошы ў вытворчасць, якая будзе дубліраваць існуючыя ў краіне аналагі. Неабходна дакупляць толькі тое абсталяванне, у якім ёсць вострая патрэба. Задача зрабіць прадпрыемства кампактным і знізіць яго выдаткі. Акрамя таго важна знайсці іншыя кірункі ў вытворчасці сумесна з вядучымі прадпрыемствамі краіны», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Паводле статыстычных зводак, у Барысаўскім раёне няшмат праблемных прадпрыемстваў. Па некаторых з іх плануецца вырашыць пытанне аб рэструктурызацыі даўгоў. Як адзначыў **намеснік старшыні Барысаўскага райвыканкама Леанід ВАРОНІЧ,** большасць прадпрыемстваў развіваецца дынамічна. «Паспяхова рэалізаваны 31 інвестыцыйны праект за 2011—2016 гады. Сёлета плануецца 12 буйных інвестыцыйных праектаў», — праінфармаваў ён.

На стратэгію па развіцці Барысаўскага раёна ў 2017—2020 гадах ускладаюцца вялікія надзеі. Вектар абраны. Вынік пакажа час.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

# ЗАМАК НА ПЕРАДАВОЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Апошні бой, які ператварыў яго ў руіны, адбыўся акурат сто гадоў таму. Вось як апісвае ліпеньскія падзеі 1917 года рускі генерал Антон Дзянікін, які камандаваў Заходнім фронтам расійскай арміі: «Пасля няўдачы наступлення ўцечка салдат стала ўсё ўзрастаць і да цемнаты дасягнула вялізных памераў. Салдаты, стомленыя, знерваваныя, не звыклыя да баёў і грукату гармат, пасля стольких месяцаў зацішша, бяздзейнасці, братання і мітынгаў, натоўпамі пакідалі акопы, кідаючы кулямёты, зброю, і сыходзілі ў тыл... Ніколі мне яшчэ не даводзілася біцца пры такой перавазе ў колькасці штыкоў і матэрыяльных сродкаў. Ніколі яшчэ абстаноўка не абяцала такіх бліскучых перспектыў... І ўсё пайшло прахам...»

Сённяшні выгляд Крэўскага замка — амаль такі, як і сто гадоў таму. Хроніка яго разбурэння адлюстравана на ўнікальных фотаздымках з калекцыі журналіста Уладзіміра Багданава, якія экспануюцца ў Нацыянальным гістарычным музеі ў Мінску. Дагэтуль, акрамя нямецкага афіцэра Фрыца Хофмана, яго баявых таварышаў і, вядома ж, уладальніка калекцыі, рэдкія кадры ніхто не бачыў.

Варонкі ад артылерыйскіх абстрэлаў 100-гадовай даўніны дагэтуль «упрыгожваюць» унутраны двор Крэўскага замка.

— Гэтай маленькай выставай я хацеў бы прыцягнуць увагу да Крэўскага замка, які з'яўляецца адным з маіх любімых аб'ектаў па тэме Першай сусветнай вайны, — гаворыць Уладзімір Багданаў, які на працягу многіх гадоў даследуе гэты гістарычны перыяд. — Ён пражыў Вялікае Княства Літоўскае, выстаяў падчас польскай дзяржавы, Расійскай імперыі, Савецкага Саюза. Цяпер замак — частка мірнай Беларусі. Але менавіта сёння ён вядзе апошні бой: калі своечасова не прыняць меры, ад аднаго з найстарэйшых архітэктурных збудаванняў нашай краіны нічога не застанецца.

Нямецкія салдаты часоў Першай сусветнай вайны добра ведалі, дзе знаходзяцца іх войскі. Аб гэтым сведчыць хоць бы такі подпіс да аднаго з фотаздымкаў: «Наша пазіцыя ў замку Ягелонаў, пабудаванага ў XIV стагоддзі». Але іх праціўнікаў мала хваляваў лёс архітэктурнага збудавання. Грубыя сцены Крэўскага замка былі ўсяго толькі ключом у тактычнай абароне немцаў. Іх магла пакарыць толькі вялікая колькасць выстралаў самага буйнога калібру. «На жаль, — піша рускі і польскі генерал Іосіф Доўбар-Мусніцкі, — мне далі мала выстралаў, таму нанёс невялікую шкоду».

— У дзяцінстве Крэўскі замак для нас асаблівага значэння не меў, бо мы каля яго нарадзіліся, жылі, — расказвае жыхар Крэва Іван Магер. — Мы ведалі, у якім стане ён знаходзіцца, але важнейшымі для нас, дзяцей, былі нямецкія акопы, бліндажы — там добра было гуляць у вайну. Першая сусветная не толькі знішчыла замак, яна нічога не пакінула ад Крэва: за тры гады вайны тут не засталося ніводнага будынка і падворка — адны варонкі.

Тэма Першай сусветнай апошнім часам усё часцей гучыць у сценах Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі. Па словах яго дырэктара Алега Рыжкова, яна перастае быць забытай, як было яшчэ некалькі гадоў таму. «Сёння мы ўпэўнена кажам пра тое, што беларусы ўплывалі на пэўныя сусветныя падзеі, непасрэдна ўдзельнічалі ў іх, што на беларускай зямлі былі падпісаны ўнікальныя палітычныя дакументы», — зазначае дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
**Фота Уладзіміра БАГДАНАВА і з яго калекцыі.**

Будынкі для асабовага складу каля ўсходняй сцяны ўнутры замкавага двара. Лета 1916 года.

Тое, што засталося ад усходняй сцяны Крэўскага замка. Вясна 2017 года.

**Колькі месяцаў таму «Звязда» ўздымала балючыя для мясцовых жыхароў і актуальныя для ўсёй беларускай культуры пытанні правядзення работ на тэрыторыі Крэўскага замка і магчымае аднаўленне ці кансервацыю руінаў. Так, паводле меркаванняў спецыялістаў, пра поўнае аднаўленне замка гаворкі пакуль ісці не можа: не захавалася дакументаў з дакладнымі апісаннямі замка, таму сёння нават складана ўявіць, як ён насамрэч выглядаў у старажытныя часы. Аднак адрэстаўрыраваць некаторыя элементы ўсё ж магчыма. Гаворка ідзе пра Княжаўскую вежу: да яе час паставіўся найбольш ашчадна. Мяркуецца, што менавіта з гэтага і пачнуцца работы ў замку. Паводле папярэдняй інфармацыі, Фонд Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва плануе выдзеліць на правядзенне адпаведных работ каля 100 тысяч рублёў. Гэтыя фінансы будуць скіраваныя не толькі на саму рэстаўрацыю і кансервацыю, але і на добраўпарадкаванне тэрыторыі вакол старажытных руінаў, падтрыманне належнага санітарнага стану. Нават разбураныя сцены сваім рамантычным вобразам могуць шмат распавесці зацікаўленаму.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Каля Аль-Аксы прынялі рамкі металадэтэктараў

Ізраільскія паліцэйскія знялі рамкі металадэтэктараў, якія раней усталявалі каля мячэці Аль-Акса. Гэта зроблена па рашэнні кабінета міністраў на чале з прэм'ерам Біньямінам Нетаньяху: улады вырашылі ўсталяваць на месцы спецыяльныя камеры відэаназірання. Кіраўніцтва мячэці, аднак, паўмерамі незадаволена і патрабуе дэмантажу ўсякіх сістэм забеспячэння бяспекі. Меры бяспекі сталі больш жорсткія пасля тэракта, у якім загінулі двое паліцэйскіх. Узмацненне мер бяспекі абярнулася канфліктамі ісламскай абшчыны з сіламі правапарадку, за апошнія два дні ў іх загінулі чатыры палесцінцы, сотні атрымалі раненні. У канцы мінулага тыдня кіраўнік Палесцінскай аўтаноміі Махмуд Абас заявіў аб разрыве ўсіх кантактаў з Ізраілем з-за новых мер бяспекі каля Храмавай гары.

### Па меркаванні МВФ, рост сусветнай эканомікі працягнецца

Міжнародны валютны фонд пацвердзіў прагнозы росту сусветнай эканомікі ў бягучым годзе на 3,5% і павелічэнне сусветнага ВУП налета яшчэ на 0,1%. Было адзначана зніжэнне ролі ЗША ў якасці крыніцы росту сусветнай эканомікі, але тэндэнцыя росту самой амерыканскай эканомікі захаваецца. Сёлета яна вырасце на 2,5%. Палепшаны і прагноз па брытанскім ВУП. Эксперты МВФ чакаюць узмацнення росту сусветнага гандлю таварамі і паслугамі да 4% у 2017 годзе. У цэлым ліпеньская справаздача шмат у чым адлюстроўвае вынікі перагляду эканамічных прагнозаў па выніках місій супрацоўнікаў МВФ у шэраг краін. Палепшаны прагнозы росту эканомікі еўразоны ў цэлым і для Германіі і Францыі паасобку.

### Урад Польшчы правядзе судовую рэформу, нягледзячы на вета прэзідэнта

Рэформа будзе праведзена незалежна ад таго, ці рэалізуе кіраўнік дзяржавы свой намер, заявіў афіцыйны прадстаўнік урада рэспублікі Рафал Бахенек. «70% палякаў падтрымліваюць рэформы судовай сістэмы, прапанаваныя PiS (кіруючай партыяй «Права і справядлівасць»). Цяжка зразумець рашэнне спадара прэзідэнта аб ветаванні законаў аб Нацыянальным судовым савеце і Вярхоўным судзе», — заявіў Бахенек у эфіры Польскага тэлебачання. Паводле яго слоў, абвясціўшы пра намер накласці вета на законы, прэзідэнт узяў на сябе адказнасць за гэтую рэформу. Прэм'ер-міністр Беата Шыдла ў найбліжэйшы час сустрэнецца з міністрам юстыцыі Збігневам Зебрам, каб абмеркаваць сітуацыю, якая склалася, дадаў Бахенек.

### Microsoft адмаўляецца ад графічнага рэдактара Paint

Карпарацыя Microsoft прызнала графічны рэдактар Paint састарэлым і заявіла аб намеры прыбраць яго з аперацыйнай сістэмы Windows. У апублікаваным кампаніяй спісе функцый, якія прызнаныя састарэлымі, гаворыцца, што яны не знаходзяцца ў стадыі актыўнай распрацоўкі і могуць быць выдаленыя ў будучых абнаўленнях. Чарговае маштабнае абнаўленне аперацыйнай сістэмы Windows 10 пад назвай Fall Creators Update выйдзе восенню гэтага года. Рэдактар Paint быў неад'емнай часткай Windows з моманту выхаду першай версіі AC у 1985 годзе. Праграма змяшчае базавыя прылады для рэдагавання графічных выяў і дазваляе ствараць малюнкі.

# «Звязда» збірае сяброў

**На спартыўным свяце, прымеркаваным да 100-годдзя газеты, выступяць вядомыя спартсмены Беларусі, сярод іх неаднаразовыя чэмпіёны свету па гіравым спорце браты Сігневічы. Яны пакажуць сілавое шоу з гірамі, правядуць майстар-клас, у якім змогуць прыняць удзел усе ахвотныя. Прадэманструюць простыя, але карысныя практыкаванні для кожнага аматара спорту, кульмінацыяй праграмы стане дэманстрацыя рарытэта — гіры 1874 года з царскай каронай.**

Малодшы з братоў — Ігар Сігневіч адзначае, што сёння здаровы лад жыцця — залог поспеху ва ўсім. «У сучасных умовах тэмп жыцця вельмі хуткі. Каб яго не проста вытрымліваць, а ставіць перад сабой мэты і іх дасягаць, неабходна быць фізічна здаровым чалавекам. У суботу нам на асабістым прыкладзе хацелася б паказаць, што магчыма дасягаць вынікаў у спорце, сумяшчаючы трэніроўкі з прафесійнай дзейнасцю».

Падзяляе гэты пункт гледжання і старэйшы з братоў — Вадзім — заслужаны майстар спорту, чатырохразовы чэмпіён свету па гіравым спорце. Кампанію братам Сігневічам складуць Андрэй Гук — майстар спорту міжнароднага класа па паўэрліфтынгу, шматразовы чэмпіён Еўропы, Вячаслаў Харанека — беларускі асілак, аўтар сотні рэкордаў, Андрэй Зазерскі — шматразовы чэмпіён краіны па рукапашным боі, пераможца тэлепраекта «Бітва Тытанаў» і «Зачыстка».

**Сілавое шоу стартуе адразу пасля адкрыцця, якое адбудзецца 29 ліпеня ў 11.00 на стадыёне сталічнага ліцэя №1 на праспекце Газеты «Звязда». Акрамя сілавога шоу гледачы ўбачаць майстар-клас ад чэмпіёнаў краіны МФК «Сталіца» і лепшых прадстаўнікоў варкаўта Беларусі.**

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# ЖЫЦЦЁ — КАШТОЎНАЕ

## Нават калі гэта жыццё маленькай птушкі

Сімвалічна, што ў Дзень пажарнай службы бабруйскія ратавальнікі падаравалі жыццё стрыжу, які трапіў у пастку. Аддзяленне аварыйна-ратавальнай часці №1 ехала на заняткі, калі іх тармазнуў нейкі мужчына на веласіпедзе. «Хлопцы, дапамажыце птушцы, — папрасіў ён, паказваючы на сцяну будынка, дзе з апошніх сіл трапятаўся стрыж. — Другі дзень мучыцца, небарака, самастойна вызваліцца не можа». Да мужчыны хутка далучыліся і іншыя спачуваючыя, якія былі сведкамі птушыных пакут. Ратавальнікі не аднойчы прыходзілі на дапамогу жывёлам, не пакінулі ў бядзе і птушку. Аперацыю па вызваленні правяла каманда ў складзе прапаршчыка Яўгена Лася, камандзіра аддзялення Уладзіміра Кітова і начальніка каравула Івана Макарэвіча. Іх дзеяннямі кіраваў падпалкоўнік Дзмітрый Сказаў. Як аказалася, стрыж зачапіўся за лёску і, калі б не чулыя людзі, загінуў бы.

Пад апладысменты людзей, якія назіралі за дзеяннямі ратавальнікаў, птушку выпусцілі. Дарэчы, для бабруйчан ратавальнікі свае людзі. У горадзе ніводнае свята не абыходзіцца без іх удзелу, а тым больш дзіцячыя аздараўленчыя лагеры. Сімвалічна, што ў гэты дзень у Бабруйску да пажарных часцей падыходзілі школьнікі з ахапкамі кветак, каб павіншаваць сваіх мужных сяброў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# МЕДАЛЬНЫ ЗВОН

**З перамогай вярнуліся беларускія школьнікі з 58-й Міжнароднай матэматычнай алімпіяды, якая прайшла ў Рыа-дэ-Жанэйра (Бразілія).**

Залаты медаль заваяваў выпускнік гімназіі №51 г. Гомеля Ягор Дубовік. У індывідуальным заліку ён заняў сёмае месца, набраўшы 29 балаў з 42 магчымых.

Сярэбраным медалём узнагароджаны выпускнік сталічнай гімназіі №41 Аляксей Васілеўскі, бронзавымі медалямі — выхаванцы Ліцэя БДУ Андрэй Нарадзецкі, Антон Палюховіч, Ілья Пчалінцаў і Аляксандр Юран.

Не засталіся без узнагарод нашы школьнікі і на 48-й Міжнароднай алімпіядзе па фізіцы, якую сёлета прымала Інданезія. Усе ўдзельнікі беларускай зборнай вярнуліся дамоў з медалямі. Мікіта Ігнацюк (выпускнік ліцэя №1 імя А. С. Пушкіна г. Брэста) і Яўген Шарамед (выпускнік гімназіі №10 г. Мінска) заваявалі сярэбраныя ўзнагароды. А Павел Курач (выпускнік брэсцкага ліцэя №1), Мікіта Стрыжак (выпускнік Ліцэя БДУ) і Валянцін Дарафееў (выпускнік Магілёўскага дзяржаўнага абласнога ліцэя №3) былі ўзнагароджаны бронзавымі медалямі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Рэпартаж на колах

# ВАМ ПАСЫЛКА!

## Як мы развозілі пошту разам з кур'ерам

**Калі бачыце па горадзе сінюю машынку з белай паласой на баку, ведайце: за рулём — паштовы кур'ер. Адным ён вязе камплект ручнікоў беларускай вытворчасці, другім — тэлефон, прысланы з Кітая, трэцім — важныя дагаворы і свежую прэсу.**

Сённяшнюю змену мы праводзім разам з **кур'ерам Сяргеем РЫЖКОЎСКІМ.** На пошце мужчына працуе больш за пяць гадоў. Трапіць сюды, прызнаецца, было марай дзяцінства. Таму, калі ўбачыў на біржы вакансію кур'ера, адразу прыйшоў на гутарку.

За дзень Сяргей паспявае аб'ехаць у сярэднім 30 пунктаў па горадзе. Лагістыку маршруту дапамагае прадумаць праграма «Белтрансспадарожнік», якая ўсталявана ў яго на тэлефоне. Калі кур'ер прыязджае на месца, то адзначаецца ў праграме, і ў інтэрнэце відаць, калі якая пасылка была дастаўлена. Так бы мовіць, фіксуецца кожны крок. Таму, калі ў кагосьці ўзнікнуць пытанні да сэрвісу, усё можна праверыць.

З раніцы наш кіроўца праходзіць медагляд і атрымлівае аўто. Загружаемся на паштамце: у багажнае аддзяленне машыны Сяргей спрытна складвае некалькі каробак. Усе запячатаны. Калі ў пасылцы знаходзіцца штосьці крохкае, на ўпакоўцы стаіць адпаведнае абазначэнне, так што кур'ер бачыць, з якім грузам трэба быць звышасцярожным. Выязджаем — нас ужо чакаюць у інтэрнэт-краме абутку, дзе мы павінны забраць заказы для пакупнікоў. Гэты гандлёвы пункт далёка не адзіны, які карыстаецца паштовым кур'ерам для дастаўкі сваіх тавараў па ўсёй краіне. Больш за чатыры тысячы беларускіх інтэрнэт-крам супрацоўнічаюць з Белпоштай у гэтым кірунку. Прадпрыемства распрацавала для іх пакеты паслуг «E-commerce». Для прадаўцоў гэта зручна: у Белпошты самая буйная лагістычная сетка па краіне.

— Мы даўно чакалі такой прапановы, — заўважае **старшы менеджар абутковай інтэрнэт-крамы Originals Эдуард КАРАПЕЦЯН,** калі мы забіраем заказ. — Вялікая крама можа дазволіць сабе кур'ерскую сетку, а для маленькіх гэта нявыгадна. Калі яшчэ па Мінску нармальна кур'ера ўтрымліваць, то па абласцях няма сэнсу.

Мы тым часам забіраем дзве новенькія пары абутку, сядаем у аўто і рушым па маршруце далей. Туфлі даставім крыху пазней, а пакуль развозім тавары з інтэрнэт-крамы самой Белпошты. Прадпрыемства яе адкрыла ў 2015 годзе, каб прасоўваць беларускіх вытворцаў. На shop.belpost.by прадстаўлены не толькі буйныя кампаніі. Асартымент велізарны — ад адзення да садоўвага інструменту. Паштовая крама налічвае ўжо сем тысяч пастаянных кліентаў. За апошні год колькасць заказаў выросла ў тры разы. Большасць пакупнікоў — з Мінска, Магілёва, Ліды, Віцебска. Адметна, што даведацца пра тое, што прадаецца праз анлайн-краму, могуць і тыя беларусы, якія не карыстаюцца інтэрнэтам. Пошта выпускае адмысловыя каталогі тавараў: яны ляжаць у кожным аддзяленні. А з красавіка працуе дастаўка і па Расіі. Ужо ёсць першыя заказы.

Надзеі КУДЗІНАЙ мы прывезлі пасцельную бялізну і цацку для дзяцей.

За рулём паштовы кур'ер Сяргей РЫЖКОЎСКІ.

Мы спыняемся ў Калодзішчах каля аднаго з дамоў. За пасылкай з-за варот выходзіць гаспадыня дома Надзея Кудзіна. Перадаём жанчыне вялікую каробку — там камплект пасцельнай бялізны і цацка.

— Я ўвогуле часта заказваю што-небудзь у паштовай інтэрнэт-краме, — расказвае жанчына. — У асноўным дзіцячае адзенне, касметыку. Задавальняе і кошт, і якасць. Тут найбліжэйшая крама прамтавараў — за тры кіламетры ад дома, а ў мяне яшчэ дзіця грудное. Таму мне зручна, калі пакупкі на дом прывозяць.

З кліентамі Сяргей Рыжкоўскі вельмі ветлівы. Расказвае, што некаторых ужо ведае ў твар. Пастаянна прывозіць міжнародныя пасылкі, маркі. Акрамя гэтага, ён дастаўляе экспрэс-лісты, канверты, можа аформіць падпіску.

Паслугі паштовага кур'ера вельмі запатрабаваны ў арганізацый. Асноўныя кліенты — банкі, мабільныя аператары, страхавыя кампаніі, буйныя прадпрыемствы. Ім дастаўляецца, напрыклад, прэса, уваходная карэспандэнцыя (нягледзячы на электронны дакументазварот, многія любяць, каб пад рукой былі і папяровыя копіі). Арганізацыям гэта выгадна: не трэба ўтрымліваць машыны, эканоміцца час сакратароў, якім няма неабходнасці хадзіць на пошту.

Усяго па краіне працуе паўтары тысячы паштовых кур'ераў. А значыць, за дзень сінія машыны прадпрыемства паспяваюць даставіць дзясяткі тысяч пасылак.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*
**Фота Надзеі БУЖАН**

■ Святы

## ЯК КАХАЦЬ, ДЫК КАРАЛЕВУ, ЯК ВЫПІСВАЦЬ, ТО «ЗВЯЗДУ»!

Лічаныя дні засталіся да стагоддзя газеты — найстарэйшай з рэспубліканскіх, адзінай беларускамоўнай, шаноўнай, горача любімай, роднай... І адзначаць гэтае свята яна будзе разам са сваімі чытачамі-падпісчыкамі, сябрамі, усімі ахвотнымі — **у суботу 29 ліпеня з 11 гадзін** на спартыўнай пляцоўцы сталічнага Ліцэя №1 (праспект Газеты «Звязда», 6А).

Гасцей, як паведамлялася, там чакае мора спартыўнага драйву, прыемныя сустрэчы і знаёмствы (у тым ліку са звяздоўцамі), цікавыя размовы, аўтограф-сесіі, вершы...

Помніце:

*Раяць справа, вучаць злева...*
*Я і сам не прападу:*
*Як кахаць, дык каралеву,*
*Як выпісваць, то «Звязду»!*

Адпаведна кожны, хто на свяце захоча афармiць падпіску (сабе альбо сваім родным), зможа гэта зрабіць і такім чынам вярнуцца дамоў не толькі з квітанцыяй, але і з адмысловым звяздоўскім значком, памятным сувенірам ад газеты, якую любілі яшчэ прапрадзеды.

■ Філатэліст

## НАША МАРКА ЗНОЎ У ДЗЯСЯТЦЫ — НАЙПРЫГАЖЭЙШЫХ...

**На Венскай міжнароднай філатэлістычнай выстаўцы падведзены вынікі конкурсу на званне самай прыгожай маркі свету, якая выйшла ў абарачэнне ў 2016 годзе. Удзел у конкурсе бралі больш за 70 краін. У дзясятку найлепшых увайшлі:**

1-е месца — тытул «Самая прыгожая марка свету 2016 года», кубак «Галоўны прыз выстаўкі ВІПА» — Партугалія (серыя марак «Партугальская кансервавая прамысловасць»), 2-е месца — Іспанія (блок «Асобы: Расіа Хурада»), 3-е месца — Швейцарыя (счэпка марак «Гатарда-2016»), 4-е месца — Фарэрскія астравы (блок «Штамп на рыбінай скуры»)... 8-е месца — назва кажа сама за сябе — блок «Пчалаводства ў Беларусі».

Варта адзначыць, што Венская міжнародная філатэлістычная выстаўка праходзіць у сталіцы Аўстрыі з 1881 года і з'яўляецца самай вядомай традыцыйнай філатэлістычнай выстаўкай Еўропы. Журы конкурсу складаецца з вядомых мастакоў марак, журналістаў, прадстаўнікоў Аўстрыйскай паштовай адміністрацыі і Аўстрыйскага нацыянальнага дзяржаўнага дома друку (аўстрыйская марка ў конкурсе не ўдзельнічае).

Што да беларускай, то раней у дзясятку найпрыгажэйшых уваходзілі блокі, прысвечаныя двухсотгоддзю з дня нараджэння Напалеона Орды, васемсотпяцідзесяцігоддзю стварэння Крыжа Еўфрасінні Полацкай, а таксама марачны ліст «Слуцкія паясы».

Паштовы блок «Пчалаводства ў Беларусі» выпушчаны ў абарачэнне 12 жніўня 2016 года.

Мастак Аляксандр Міцянін, дызайн Марыны Віткоўскай.

### Галасуем за беларускую марку

Асацыяцыя дзяржаўных паштовых аператараў Еўропы (PostEurop) праводзіць конкурс на найлепшую паштовую марку, выпушчаную па праграме «Еўропа». Тэма гэтага года — замкі і палацы.

На конкурсе прадстаўлена і марка, выпушчаная Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Беларусі. На ёй — палац Румянцавых і Паскевічаў у Гомелі.

Галасаванне працягнецца да 9 верасня. Прыняць удзел можа любы ахвотны. Для гэтага трэба зайсці на сайт www.posteurop.org/europa2017 і аддаць голас за ўпадабаную марку

■ Навіны

## Бронзавы пісьманосец

### Скульптура паштальёна з'явілася ў Жодзіне

Помнік усталявалі на вуліцы Міра каля будынка цэнтральнага гарадскога аддзялення сувязі. Сфатаграфавацца з бронзавым пісьманосцам паспелі ўжо і работнікі пошты, і звычайныя гараджане.

Скульптура менавіта паштальёна выбрана не выпадкова. Гэта прафесія заўсёды была запатрабаванай і па сёння не губляе актуальнасці, бо на паштальёнаў ускладзена важная функцыя — забяспечваць сувязь з усім светам.

**Намеснік дырэктара Мінскага філіяла Белпошты Алена ІШЧУК** расказала, што скульптуру заказвалі ў прадпрыемства з Глыбокага, якое займаецца коўкай. Помнік уяўляе сабой паштальёна часоў царскай Расіі. Тады гэта прафесія была пераважна мужчынскай. А вось веласіпед і цяпер застаецца адным з асноўных транспартных сродкаў работнікаў сувязі.

## Абноўленыя аддзяленні

### адкрыліся ў некалькіх гарадах

Адно з іх — у Століне. Мадэрнізацыя адбылася ў паштовым аддзяленні па вуліцы Церашковай. На яго ўрачыстым адкрыцці гараджан сустракаў паштальён Печкін і ўручаў фірменныя падарункі ад прадпрыемства.

— Асноўным прыярытэтам пры мадэрнізацыі паштовага аб'екта было забеспячэнне зручнасці ў абслугоўванні наведвальнікаў і аказання поўнага спектра паслуг фізічным і юрыдычным асобам, — адзначыла на адкрыцці **дырэктар Брэсцкага філіяла Белпошты Валянціна ПУХ.** — Сёння павышаная ўвага ўдзяляецца ўкараненню сучасных метадаў работы з карпарацыйнымі кліентамі і паляпшэнню якасці паслуг.

На ўрачыстым адкрыцці прысутнічаў і **намеснік старшыні Столінскага райвыканкама Міхаіл НЕСЦЯРОВІЧ.** Ён заўважыў, што мадэрнізацыя паштовага аб'екта носіць у тым ліку і сацыяльную скіраванасць. У новым аддзяленні гараджане могуць разлічваць на індывідуальны падыход і высокі ўзровень сэрвісу.

Абнавілі аддзяленне сувязі №6 у Слоніме — па адрасе вуліца Карбышава, 26б. З падвальнага памяшкання пошта «перасялілася» ў светлы офіс. Больш камфортнымі сталі працоўныя месцы і зала для кліентаў. Абнавіліся мэбля і тэхніка.

Слонімскае аддзяленне №6 абслугоўвае каля дваццаці вуліц — гэта 517 дамоў і 759 кватэр. Штомесяц туды трэба даставіць больш за дзве тысячы газет і часопісаў, трыста лістоў і сорак пасылак.

А вось у Наваполацку, у дзясятым мікрараёне, адкрылася новае аддзяленне сувязі. Ва ўтульнай кліенцкай зале наведвальнікі змогуць атрымаць паштовыя і няпрофільныя паслугі: адправіць пісьмовую карэспандэнцыю, пасылкі, атрымаць пенсіі і дапамогі, падпісацца на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, аплаціць «камуналку». Прадстаўлены шырокі асартымент марак, паштовак, канвертаў, картак для пасткросінгу.

Рэжым працы аддзялення Наваполацк-10 наступны. З панядзелка па пятніцу паштовы аб'ект адкрыты з 10 да 19 гадзін, у суботу — з 10 да 16. У нядзелю выхадны.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

26 ліпеня 2017 г. №27 (411)

стар. 3

**Як завабіць наведвальнікаў у бібліятэку?**

стар. 6

**Чэмпіёнамі становяцца... насуперак**



стар. 8

**"Гарадскі" ўспамін Улы**

ТЭМА ТЫДНЯ

## ФІЗКУЛЬТ-УРА!

### ЦІ ЎСЮДЫ Ў РЭГІЁНАХ КРАІНЫ ЁСЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ ЗАЙМАЦЦА СПОРТАМ?

Фота БЕЛТА.

**АПОШНІЯ статыстычныя даныя кажуць пра тое, што ўсё больш беларусаў выбіраюць здаровы лад жыцця і пачынаюць займацца фізкультурай. Міністэрства спорту і турызму краіны вядзе статыстыку, згодна з якой кожны чацвёрты жыхар, а гэта 2 млн 157 тыс. 349 беларусаў, або 22,5% насельніцтва, займаецца фізкультурай. Лічба ўражвае. Калі параўноўваць па гэтым паказчыку Беларусь з краінамі-суседкамі, то яна крыху саступае Расіі (23—30% насельніцтва, розныя крыніцы называюць розныя лічбы) і значна наперадзе Украіны (13% насельніцтва). Прытым у спартыўным ведамстве адзначаюць, што літаральна за 8—10 гадоў лічба фізічна актыўных грамадзян у нашай краіне павялічылася на 4%. Але ці заўжды гэта актыўнасць знаходзіць належныя ўмовы для прымянення?**

стар. 4

ПА СУТНАСЦІ СПРАВЫ

## ІМІДЖ КРАІНЫ І... БІЗНЕС

**Мінімальнае ўмяшанне дзяржавы ў эканамічную дзейнасць суб'екта гаспадарання і павышэнне асабістай адказнасці кіраўніка. Пра гэта і іншае беларускія сенатары разважалі падчас круглага стала, што прайшоў у Гомелі. У краіне завяршаецца абмеркаванне пакета прававых актаў, накіраваных на развіццё прадпрымальніцтва. Савет Рэспублікі прыняў у ім самы актыўны ўдзел. Важныя дакументы былі прааналізаваны з удзелам членаў Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, а таксама прадпрымальнікаў рэгіёна і прадстаўнікоў выканаўчай улады.**

Гомельшчына — тэрыторыя патэнцыялу, генерацыі і распаўсюджвання інавацый, адзначае **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ,** і менавіта таму сенатары выбралі горад над Сожам для сваёй паездкі:

— Штогод апошнія пяць гадоў вобласць, яе асобныя раёны і гарады перамагаюць у рэспубліканскіх конкурсах, якія вызначаюць рэгіёны, што спрыяюць вядзенню бізнесу. Мэта дзяржавы, як і бізнесу адна — павышэнне дабрабыту і якасці жыцця насельніцтва.

Доля малога і сярэдняга бізнесу ў бюджэце Гомельшчыны сёння складае 17%, гаворыць **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Алег БАРЫСЕНКА.** Між тым планы на 2020 год — 30%. **Член Савета Рэспублікі, старшыня Ваўкавыскага райвыканкама Міхаіл СІЦЬКО** адзначае, што самым галоўным вынікам перамен, якіх чакаюць ад прыватнага бізнесу, будзе папаўненне мясцовых бюджэтаў:

— Гэта вядзе да пашырэння сацыяльных магчымасцяў. У нашым раёне за паўгода зарэгістравалася ўжо 110 індывідуальных прадпрымальнікаў, і з іх пяць — малыя прадпрыемствы. Усяго цяпер іх 376. Прыходзяць да нас не толькі беларусы, але і замежнікі. Трэба, каб прадпрымальніцтва мела магчымасць атрымання аддачы. Каб грошы, якія будуць укладацца ў развіццё, стымулявалі павышэнне заробкаў.

стар. 2

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## У ЦЭНТРЫ СУСВЕТНЫХ ПАДЗЕЙ

**Мар'яна Шчоткіна правяла сустрэчу з адміністратарам ПРААН**

На мінулым тыдні ў Нью-Ёрку ў штаб-кватэры Праграмы развіцця ААН сустрэліся намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Мар'яна Шчоткіна і адміністратар ПРААН Ахім Штайнер. Цэнтральнай тэмай сустрэчы сталі сумесныя двухбаковыя праекты.

Як адзначае БЕЛТА, віцэ-спікер верхняй палаты павіншавала Штайнера, які ў красавіку 2017 года быў назначаны на пасаду адміністратара. Акрамя таго, яна падзякавала ПРААН за праграмы, якія Беларусь рэалізуе сумесна ў такіх галінах, як экалогія, эфектыўнае кіраванне, эканоміка і падтрымка груп насельніцтва. Мар'яна Шчоткіна таксама выказала ўдзячнасць за дапамогу ў пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

Падчас гутаркі намеснік старшыні Савета Рэспублікі адзначыла, што краінавая каманда ПРААН у Беларусі пад кіраўніцтвам рэзідэнта-каардынатара Санакі Самарасінхі адрозніваецца высокім прафесіяналізмам і ініцыятыўнасцю. Асобна Мар'яна Шчоткіна падзякавала ПРААН за ініцыятыву рэалізацыі праекта па тэхнічнай дапамозе ва ўмацаванні патэнцыялу нацыянальнага каардынатара і ўцягванне парламента Беларусі ў працу па дасягненні Мэт устойлівага развіцця.

## «УСХОДНІЯ» ІНВЕСТЫЦЫІ

**Адбылася рабочая сустрэча Сяргея Рахманава і намесніка старшыні групы дружбы Японія — Беларусь парламента Японіі Масака Моры**

З японскага боку на сустрэчы прысутнічалі таксама прадстаўнікі кампаній, якія займаюцца нафтаперапрацоўкай, будаўніцтвам, вырабам медыцынскіх прэпаратаў і іншымі відамі бізнесу.

Удзельнікі абмеркавалі такія тэмы, як двухбаковае японска-беларускае міжпарламенцкае і інвестыцыйнае супрацоўніцтва. У сустрэчы таксама прынялі ўдзел парламентарыі Ірына Старавойтава, Святлана Герасімовіч, Віктар Сірэнка, члены рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентам Японіі.

На мінулым тыдні Сяргей Рахманаў, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы сустрэўся з прадстаўнікамі карпарацыі па здабычы солі правінцыі Цзянсу Кітайскай Народнай Рэспублікі і СЗАТ «Кампанія па развіцці індустрыяльнага парка Вялікі Камень». Галоўнай тэмай перагавораў таксама сталі інвестыцыі.

## АСАБЛІВАЯ ЎВАГА — НА РАЁНЫ

**Член Прэзідыума Савета Рэспублікі Аляксандр Папкоў наведаў Дрыбінскі раён Магілёўскай вобласці**

У рамках свайго візіту старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні паўдзельнічаў у пасяджэнні Дрыбінскага раённага выканаўчага камітэта. На ім Аляксандр Папкоў звярнуў увагу на тое, што сёння неабходна дакладна каардынаваць працу кіруючых органаў раёна для паўсюднага развіцця рэгіёна.

Акрамя таго, Аляксандр Папкоў правёў асабісты прыём грамадзян, на якім былі прыняты ўсе ахвотныя. Галоўнымі пытаннямі нефармальных зносін сталі новыя працоўныя месцы, вядзенне асабістых падсобных гаспадарак, а таксама арганізацыя спрыяльных умоў для вядзення бізнес-праектаў.

Усе, хто звярнуўся да старшыні Пастаяннай камісіі, атрымалі неабходныя тлумачэнні. Рашэнне праблем, якія запатрабавалі дадатковага вывучэння, Аляксандр Папкоў узяў на кантроль.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ЗАДАЦЬ ПЫТАННЕ І АТРЫМАЦЬ АДКАЗ

## Сустрэчы з насельніцтвам назвалі днём адкрытага пісьма

**Раз на год у кожным сельсавеце Лунінецкага раёна праходзяць сустрэчы прадстаўнікоў улады з насельніцтвам, дзе разглядаюцца пытанні жыццядзейнасці на акрэсленай тэрыторыі. На сустрэчу прыязджае старшыня райвыканкама разам з кіраўнікамі асноўных раённых службаў. Сюды запрашаюць прадстаўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый, якія функцыянуюць на тэрыторыі пэўнага сельсавета. Абмяркоўваюцца самыя розныя праблемы, уздымаюцца пытанні, якія хвалююць жыхароў населеных пунктаў.**



Старшыня сельскага Савета Валерый КРАСНІКЕВІЧ каля помніка ў Сінкевічах.

Мерапрыемства назвалі днём адкрытага пісьма, бо своеасаблівы маніторынг грамадскай думкі праводзіцца загадзя. Людзям даюць магчымасць пакідаць свае пытанні і прапановы ў паштовай скрыні, якая ўстанаўліваецца ў сельскім Савеце. Таму на сходзе некаторыя аўтары пытанняў адразу атрымліваюць адказы. Летась такая сустрэча ў Сінкевіцкім сельскім Савеце праходзіла 18 мая. Па яе выніках складзены пратакол, дзе адлюстраваныя даручэнні адпаведным службам на падставе скаргаў і прапаноў грамадзян.

Са старшынёй сельвыканкама Валерыем Краснікевічам праглядаем гэты дакумент. Многія яго пункты пазначаныя як выкананыя. Напрыклад, у адным з лістоў, што былі агучаныя на дні адкрытага пісьма, жыхары вёскі Мокрава пакінулі просьбу адрамантаваць дарогу на вуліцы Янкова, аналагічная заява паступіла з вёскі Вострава, там указалі асабліва праблемны ўчастак ад чыгуначнага моста да вуліцы Машэрава. Рамонт названых участкаў дарог праведзены ў другім квартале мінулага года.

Наогул пытанне стану дарог адно з самых праблемных у Сінкевіцкім сельсавеце. Пра дарогі найбольш гаварылі і на сустрэчы ў маі гэтага года. На тэрыторыі ўсяго 30 працэнтаў асфальтаваных дарог, 40 працэнтаў — гравійныя, астатнія пясчаныя. Сельвыканкам скарыстаў суседства з вядомым у краіне прадпрыемствам «Граніт» і заключыў з ім дагавор на бязвыплатнае выдзяленне шчэбеню і адсеву для падсыпкі дарог. Такім чынам яшчэ летась былі падсыпаныя чатыры вуліцы ў аграгарадку Сінкевічы. Сёлета «Граніт» зноў выдзеліў матэрыялы, якія вырашана накіраваць для паляпшэння дарог у вёсцы Мокрава. На дзвюх вуліцах спецыялісты ДРБУ-101 работу правялі, тры іншыя вуліцы чакаюць сваёй чаргі.

Валерый Краснікевіч расказвае, што на работу па добраўпарадкаванні вуліц нярэдка выходзяць і самі жыхары вёсак. Менавіта з іх дапамогай быў падсыпаны ўчастак дарогі, які злучае вёскі Мокрава і Вострава. Талакой зрабілі ямачны рамонт працягласцю каля кіламетра на вуліцы Янкова ў вёсцы Мокрава.

Здараецца, людзі задаюць пытанні на першы погляд дробныя, ды, аказваецца, актуальныя для іншых. Так, адзін з жыхароў Сінкевічаў пытаўся, ці можна выпісаць у лясніцтве дроў на ўмовах саманарыхтоўкі. На мерапрыемстве прысутнічаў дырэктар лясгаса Вячаслаў Торчык, які растлумачыў парадак такой выпіскі. Некаторыя жыхары ўжо скарысталі зручную для іх форму нарыхтоўкі.

Варта адзначыць, што Сінкевіцкі сельсавет сёлета прырос сямю населенымі пунктамі. У ходзе рэарганізацыі далучыліся вёскі, якія раней адносіліся да Мікашэвіцкага гарсавета. Адтуль таксама прыехалі людзі на майскі сход гэтага года і адразу ўзнялі пытанне пра сенакос для прыватнай жывёлы. Бо ў вёсцы Запроссе, напрыклад, трымаюць яшчэ 17 кароў, там бывалі праблемы з кармамі. Узнятае пытанне вырашылася амаль адразу, бо ў зале прысутнічалі прадстаўнікі сельгаспрадпрыемства.

Самым прыемным момантам сёлетняга дня адкрытага пісьма стала падзяка, якую выказалі вяскоўцы за добраўпарадкаванне. Мелася на ўвазе стаянка на восем парковачных месцаў каля адміністрацыйнага будынка ў Сінкевічах. Ажыццяўленне ўказанага праекта стала магчыма дзякуючы ўдзелу асобных жыхароў, а таксама мясцовым прадпрымальнікам. Апошнія далі грошы на пакупку матэрыялаў, далучылася і сельгаспрадпрыемства, якое аплаціла 10 тон асфальту. Вяскоўцы выйшлі на суботнік і дапамаглі прывесці пляцоўку ў парадак. Цяпер там прыемна паставіць транспарт, побач клумба. Талакой жа даводзілі да ладу і помнік у цэнтры Сінкевічаў, які ўстаноўлены на брацкай магіле. Манумент паднавілі, паклалі 20 квадратных метраў тратуарнай плітцы, устанавілі бардзюр, каля ўвахода паставілі дзве лаўкі. Святочнае мерапрыемства 9 мая сёлета адбылося каля абноўленага помніка. І як бачым, гэта ацанілі людзі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*
*Лунінецкі раён.*

# ІМІДЖ КРАІНЫ І... БІЗНЕС

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»).***

Каб спрасціць умовы работы прадпрымальнікаў, паўстала неабходнасць значнага ўдасканалення заканадаўства, лічыць **член Савета Рэспублікі, генеральны дырэктар кампаніі «Марка» Мікалай МАРТЫНАЎ:**

— Каб ісці ў нагу з часам, развіваць эканоміку, даўно трэба зняць залішнюю нагрузку на бізнес. Заканадаўчая і выканаўчая ўлады на месцах павінны ствараць усе ўмовы для вядзення бізнесу. Частка парушэнняў у той жа падатковай сферы адбываецца без злога намеру — проста таму, што, каб у ёй разабрацца, трэба трымаць армію вопытных бухгалтараў. Беларускі бізнес гатовы сумленна плаціць падаткі, а чыноўнікам на месцах трэба смялей ісці насустрач наватарам у бізнесе і не баяцца браць на сябе адказнасць. У сваю чаргу, удасканаленне заканадаўства — адна з самых важных дзяржаўных задач, і нельга, каб ад адной коскі залежаў сэнс закона. Важна, каб мы ўсе чыталі законы аднолькава.

Сенатары вывучалі магчымасці і складанасці на прыкладзе шэрагу гомельскіх прадпрыемстваў. Яны наведалі вытворчую базу прадпрыемства «Гомельаблдарбуд», якое па аб'ёмах асфальтабетону, які тут выпускаецца, займае трэцяе месца ў краіне. Прадпрыемствы «Камконт» і «Алкапак» маюць розны профіль, але ж абодва ўваходзяць у свабодную эканамічную зону «Гомель-Ратон». Кіраўнік яе адміністрацыі Антаніна Яжова гаворыць, што сёння тут працуе капітал 16 краін свету. За гады існавання гэта пляцоўка для развіцця бізнесу і прыцягнення замежных інвестараў сябе апраўдала. Спрыяльныя ўмовы прыносяць плённы вынік, у чым і пераканаліся сенатары. Напрыклад, кампанія «Алкапак» сёння закрывае 95% патрэб Беларусі ў адмысловых корках для алкагольнай прадукцыі.

Інкубатар для развіцця бізнесу ў Гомельскім тэхнапарку, дзе сёння 18 рэзідэнтаў, таксама прыцягнуў увагу членаў Савета Рэспублікі. Яго дырэктар Дзмітрый Марозаў адзначае, што адна з мэт і нават місія — зрабіць так, каб таленавітыя дзеці заставаліся на радзіме, а не шукалі месца пад сонцам у іншых краінах. Спектр дзейнасці кампаній, многія з якіх робяць грошы ў віртуальнай рэальнасці, вельмі шырокі — ад распрацоўкі мабільных праграм да вырабу нанатэхналагічнага даследчага абсталявання. Напрыклад, унікальны партатыўны глюкометр для дыябетыкаў распрацавала кампанія «АйЦіСапортМі». Яе амерыканскі дырэктар па тэхналогіях фірмы Global Healthcare Management Андрыс Васкіс расказвае, што калектыў гомельскага філіяла пачынаўся з двух праграмістаў і за пяць гадоў вырас да сотні чалавек:

— І мы не спыняемся, наш вялікі і дружны калектыў будзе расці. Дарэчы, тут, на Беларусі, вельмі таленавітыя маладыя людзі. Менавіта іх трэба прыцягваць і прасоўваць далей.

Падобныя праекты, адзначаюць сенатары, трэба падтрымліваць, бо яны спрыяюць стварэнню станоўчага іміджу краіны. Дарэчы, такі бізнес-інкубатар, як у СЭЗ «Гомель-Ратон» — не адзіны ў краіне. Аналагічных у нас больш за два дзясяткі. Адным з важных пастулатаў новага дакумента пра развіццё прадпрымальніцкай ініцыятывы, які ў хуткім часе павінны быць прыняты на ўзроўні Прэзідэнта, з'яўляецца ўжыванне прынцыпу самарэгулявання бізнесу. Пры гэтым дзяржаўныя органы павінны мінімальна ўмешвацца ў дзейнасць прадпрымальнікаў. Індыкатар стварэння спрыяльных умоў для развіцця дзелавога асяроддзя ва ўсім свеце — работа малога і сярэдняга бізнесу, нагадвае **дырэктар дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Беларусі Пётр АРУШАНЬЯНЦ:**

— Работа па падрыхтоўцы пакета дакументаў праводзілася каля паўгода з удзелам максімальнай колькасці прадстаўнікоў бізнесу і дзяржаўных органаў. Сёння яна на завяршальнай стадыі. Патрабаванні да бізнесу плануецца паменшыць у разы. Напрыклад, былі сабраны і прааналізаваны ўсе пажарныя нормы. Высветлілася, што абавязковыя патрабаванні складаюць 586 пунктаў. Цяпер адсеклі ўсё, што можна перадаць на ўзровень самарэгулявання, і засталося ўсяго 58 пунктаў. У 10 разоў скарацілі колькасць пунктаў у санітарных нормах. Па ліцэнзаванні пералік скарочаны на 40%. Калі бізнес адпавядае ўстаноўленым патрабаванням, ён адкрыты і празрысты, прадпрымальнік бярэ на сябе адказнасць і пачынае дзейнасць. Ліцэнзаванне будзе заставацца толькі ў тых галінах дзейнасці, якія датычыцца пытанняў бяспекі, аховы здароўя і жыцця грамадзян.

Да таго ж, расказаў Пётр Арушаньянц, адабрана 23 найбольш распаўсюджаныя віды эканамічнай дзейнасці, у якіх засяроджана 95% суб'ектаў гаспадарання. Большасці з іх пасля прыняцця новых правілаў для прадпрымальнікаў пры адкрыцці сваёй справы не трэба будзе браць нейкія дадатковыя дазволы. Толькі — зрабіць апавяшчэнне ў мясцовыя органы ўлады і з наступнага дня можна пачынаць працаваць. Мяркуецца таксама абвясціць мараторый на павышэнне падатковых ставак. А крыху пазней распрацаваць і значныя змяненні ў Падатковы кодэкс Беларусі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

ВЁСКА ЧЫТАЕ

# ЧАМАДАН З КНІГАМІ І ПЛЮШКІ

## Чым можа здзівіць сельская бібліятэка?

**Калі да вас на аўтобусным прыпынку падыдзе невялікае карнавальнае шэсце і прапануе зазірнуць у чамадан — цалкам магчыма, што там вы адшукаеце сабе сябра на ўвесь астатні шлях. Бо здаўна вядома, што самая доўгая дарога становіцца карацейшай, калі яе займае гутарка. А кнігу, прынамсі, лічаць адной з найлепшых суразмоўніц.**

### БЯРЫ І НЕ ПЛАЦІ!

Упершыню жыхароў Новай Мышы, аграгарадка ў Баранавіцкім раёне, з «Чытаючым прыпынкам» пазнаёмілі яшчэ ў чэрвені вядомыя казачныя персанажы. Карлсан і Фрэкен Бок сустракалі пасажыраў, частавалі плюшкамі і прапаноўвалі прыгледзець сабе кнігу ў дарогу. Ідэя аказалася цікавай для чытачоў, так што гэтым разам работнікі цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы горада Баранавічы выправіліся ў аграгарадок Сталовічы.

Дзейства пачынаецца са стратэгічна выгаднай пазіцыі — побач адначасова знаходзяцца аўтобусны прыпынак, магазін, царква і асноўная дарога цераз аграгарадок.

На столік пад ранішняе сонца работнікі бібліятэкі выкладваюць кнігі, чамаданчык і кошык з білецікамі бясплатнай латарэі. Большую частку месца займаюць творы Купалы і Коласа — сённяшняя выстава прысвечана класікам. І тут жа побач з імі кніга, якая расказвае пра сакрэты дамашняга кансервавання, а ў чамадане знайшла сабе прытулак прыгодніцкая літаратура.

— Мы стараемся прыцягнуць як мага большае кола нашых чытачоў, — тлумачыць Таццяна Лайша, дырэктар Баранавіцкай ЦБС, — Лета такі перыяд, калі і дзеці, і дарослыя часцей усяго бываюць на вуліцы. А наш прыпынак паказвае магчымасці бібліятэкі, дзе ёсць кнігі на любы густ. У бясплатнай латарэі за паўтара рубля абавязкова будзе выйгрыш — якая-небудзь гаспадарчая дробязь: асвяжальнік паветра, прыхваткі, мыла... Ну, а з чамадана можна ўзяць забаўляльнае чытво, прычым ні грошай, ні абавязацельстваў для гэтага не патрэбна — мы толькі будзем удзячныя, калі на месца аднаго экзэмпляра чытач прынясе іншы — з уласнай бібліятэкі.

### З ТЭАТРАЛЬНЫМ УХІЛАМ

Пакуль што жыхары Сталовіч на «Чытаючы прыпынак» паглядаюць адначасова і зацікаўлена, і насцярожана: людзі прывыкаюць да новай з'явы. Каля прыпынку іх збірае музыка — дзеці з ліку пастаянных чытачоў зладзілі танцавальны флэшмоб — і яркія касцюмы клоўнаў. Дарэчы, і казачных герояў, і цяперашніх насельнікаў цырка іграюць самі бібліятэкары, а мясцовы Дом культуры дапамагае калегам, як правіла, апаратурай.

Не сакрэт, што бюджэт у культурных устаноў невялікі, таму бібліятэкі супрацоўнічаюць з сельскімі Саветамі. Напрыклад, апошнія дапамагаюць прыбраць смецце, або падтрымліваюць фінансава некаторыя мерапрыемствы. Напэўна, самы цесны кантакт у тых вёсках, дзе бібліятэка і сельскі Савет знаходзяцца ў адным будынку, як гэта арганізавана ў Стаўбцах. Са свайго боку, работнікі скарбніцы мудрасці бываюць ці не першымі актывістамі на суботніках, а яшчэ дапамагаюць распаўсюджваць інфармацыю, паведамленні ад мясцовых уладаў для жыхароў. Калі ідзе перапіс насельніцтва — зноў жа дапамагаюць бібліятэкары.

У Баранавіцкім раёне працуюць два цэнтры прававой інфармацыі — адзін на базе Гарадзішчанскай горада-пасялковай бібліятэкі і адзін на базе цэнтральнай раённай бібліятэкі ў Новай Мышы. Бібліятэкар бярэ на сябе клопат растлумачыць некаторыя пытанні: як перадаць спадчыну, як перапісаць дом на дзяцей...

— Зразумела, што мы не юрысты, але ў нас ёсць прававыя базы, дзе можна знайсці інфармацыю. Калі раптоўна яе там няма — звяртаемся да кампетэнтных спецыялістаў. Такога пытання, у якім зусім не маглі б дапамагчы, пакуль не сустракалі, — распавядае Таццяна Лайша.

### КНІГІ НА КОЛАХ

У месцы, дзе няма стацыянарных бібліятэк, выпраўляецца бібліёбус. Сёння такіх вёсачак у Баранавіцкім раёне 49, кожную з іх па плане трэба наведаць раз у месяц. У перасоўнай бібліятэцы камп'ютара няма, але работнік бярэ ў дарогу тыя прававыя дакументы, што найбольш цікавяць людзей. Напрыклад, нядаўна быў ажыятаж па павелічэнні пенсійнага ўзросту, і работнікі па прававых базах падрыхтавалі звесткі з новай інфармацыяй, каб потым можна было падрабязна, простай мовай растлумачыць змяненні ў заканадаўстве. Акрамя таго, бібліятэкар пастаянна возіць з сабой спіс, хто і калі з раённых уладаў вядзе прыём грамадзян. Так людзі даведваюцца, да каго можна звярнуцца з зямельным пытаннем, ці, скажам, хто дапаможа ўрэгуляваць спрэчку з суседам.

Для бібліёбуса ёсць асобны бібліятэчны фонд у 2 тысячы кніг. Змясціць іх за адзін раз у машыну немагчыма, так што кіроўца працуе па заказе: людзі ўжо ведаюць час, калі бібліятэкар прыедзе, і збіраюцца, каб абмяняць прачытаныя кнігі на новыя, заказаць літаратуру. Бывае, чытач забудзецца ці пераблытае час, у такім выпадку перасоўная бібліятэка можа нават да самага дома пад'ехаць.

Яшчэ адна асаблівасць навамышскай бібліятэкі — гэта ўсё той жа чароўны чамаданчык, што бывае на аўтобусных прыпынках. Чытач можа ўзяць любую кнігу і пакласці ўзамен сваю. Бібліятэкары сочаць, каб выбар быў рознабаковы: дакладваюць новыя кнігі з запасаў, каб утварылася «разбежка» ў тэмах і жанрах. Часта кнігі проста так дораць бібліятэцы чытачы, але стан іх бывае не самы лепшы. У фондзе падобную літаратуру чакае хуткае спісанне з-за «непрэзентабельнага выгляду», а вось у чамаданчыку жыццё выдання працягнецца.

— Цяпер мы марым распрацаваць сімвал нашай установы, стварыць нешта накшталт брэнда, каб госці маглі прыехаць і атрымаць падарунак — той жа блакноцік, магніцік — з лёгкапазнавальным сімвалам. Мы раздрукоўваем кніжкі-расфарбоўкі, прапануем блакноты з кантактнай інфармацыяй бібліятэкі. Гэта адначасова дзейнічае на папулярызацыю і дазваляе атрымаць невялікі прыбытак, — дзеліцца планамі дырэктар.

### ЗНАЁМЦЕСЯ, ГЭТА АЎТАР!

Натуральна, што сельская бібліятэка не можа канкурыраваць з гарадской у плане аўтаматызацыі. У раёне спецыфіка іншая — скіраваная на асабісты кантакт. Чытачам падабаецца, што ідзе пастаянная размова, і яны самі прапануюць формы сумеснай работы. Напрыклад, на базе бібліятэк аднавілася традыцыя вячорак — наведвальнікі аднойчы паскардзіліся, што жанчынам, асабліва сталага ўжо ўзросту, па вечарах сумна сядзець дома і нядрэнна было б, як раней, сабрацца разам у адной хаце. Так што цяпер па вечарах для бабуль адкрытыя бібліятэчныя дзверы. Наведвальніцы першым часам гамоняць пра сваё, а потым бяруць часопісы, дзеляцца адна з адной рэцэптамі, абмяркоўваюць, параўноўваюць.

Здавалася б, новыя кнігі ў фонд сельскай бібліятэкі трапляюць павольна, са значнай затрымкай. Але Таццяна Лайша такое меркаванне абвяргае:

— Калі выдаецца нейкая кніга, мы стараемся правесці сустрэчу з пісьменнікам, калі гэта беларускі аўтар. Апошнім часам такія мерапрыемствы ладзім для дарослага насельніцтва, стараемся прыцягнуць да чытання бацькоў, бо ў сям'і, дзе чытаюць мама і тата, больш шанцаў, што і дзіця возьме ў рукі кнігу. Кожны год нашы бібліятэкары адпраўляюцца на курсы павышэння кваліфікацыі. Там выкладчыкі інфармуюць, якія кнігі з'явіліся, падказваюць, як можна звязацца з выдавецтвамі. Напрыклад, нам параілі звязацца з Тамарай Лісіцкай і Ігарам Паляковым. Стэлефанаваліся, і пісьменнікі з задавальненнем прыехалі ў Баранавіцкі раён да чытачоў. Дарэчы, чым больш пісьменнікаў да нас прыязджае, тым больш людзей просяць зладзіць наступную творчую сустрэчу. Не так даўно ў нас гасцілі Віктар Лупасін і Зоя Доля — эфект атрымаўся незвычайны! І дарослыя, і моладзь засталіся пад уражаннем ад перформанса.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

*Мінск — Баранавічы — Мінск.*

**Фота з архіва.**

**РУП «ГОМЕЛЬСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 7 августа 2017 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 20% после несостоявшихся торгов по продаже объектов недвижимости и иного имущества (лот №1), расположенных по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Молодежная, 3А, принадлежащих Совместному открытому акционерному обществу «Речицапиво» на праве собственности**

**Состав лота:**

**Здание главного производственного корпуса с силосными корпусами,** инв. №340/С-300667. Общая площадь 21754,0 м кв. *Составные части и принадлежности: две пятиэтажные пристройки, пристройка, подвал под основным зданием, сусловое отделение, солодовенное отделение, два крыльца, подсилосное отделение, подработочное отделение, силосные корпуса, здание весов, навес.* **Часть здания — 2 359,4 м кв. — сдана в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание подсобного корпуса,** инв. №340/С-300672. Общая площадь 2452,3 м кв. **Часть здания — 1 662,5 м кв. — сдана в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание пункта санобработки и заправки пивцистерн,** инв. №340/С-300660. Общая площадь 158,0 м кв. **Здание сдано в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание автогаражей**, инв. №340/С-300664. Общая площадь 443,5 м кв. *Составные части и принадлежности: склад.* **Здание сдано в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание станции обезжелезивания,** инв. №340/С-300662. Общая площадь 197,6 м кв. *Составные части и принадлежности: отмостка.*

**Здание гаражей,** инв. №340/С-300661. Общая площадь 208,0 м кв. *Составные части и принадлежности: навес.* **Здание сдано в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание склада тары,** инв. №340/С-300665. Общая площадь 1002,0 м кв. *Составные части и принадлежности: рампа, навес.* **Здание сдано в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание склада для хранения сахара,** инв. №340/С-300658. Общая площадь 1044,1 м кв.

**Здание склада модуля,** инв. №340/С-300653. Общая площадь 955,7 м кв. *Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка.* **Здание сдано в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание проходной с автовесами,** инв. №340/С-300656. Общая площадь 127,1 м кв. *Составные части и принадлежности: крыльцо, весовая.*

**Здание административно-бытового корпуса с галереей,** инв. №340/С-27764. Общая площадь 1864,0 м кв. *Составные части и принадлежности: переходная галерея, три крыльца.***Часть здания — 200,0 м кв. — сдана в аренду сроком до 31.12.2017 г.**

**Здание мазутонасосной,** инв. №340/С-300651. Общая площадь 66,1 м кв. *Составные части и принадлежности: крыльцо.*

**Здание котельной,** инв. №340/С-300663. Общая площадь 1310,7 м кв. *Составные части и принадлежности: отмостка.*

**Здание склада для хранения серной кислоты,** инв. №340/С-300649. Общая площадь 64,8 м кв.

**Здание склада для хранения аммиака и масел,** инв. №340/С-300655. Общая площадь 15,9 м кв.

**Здание будки стрелочника,** инв. №340/С-300652. Общая площадь 7,1 м кв.

**Сооружения 11 ед.:** артезианская скважина, ворота раздвижные, градирня, железнодорожный путь, молниезащита, нулевая бетонная емкость мазута, ограждение завода, площадка благоустройства, проезды и площадки асфальтобетонные, резервуар воды противопожарный, резервуар с камерой хранения.

**Передаточные устройства 15 ед.:** внешние сети водопровода, внешние сети промливневой канализации, воздуховоды, газопровод среднего давления, канализация, канализация на линии фильтрации, канализация главного производственного корпуса, линия электропроводящая низковольтной сети, ЛЭП подземная на территории, ЛЭП подземная от ПЭС, самотечная канализация из полимерных труб, система поверхностного дренажа канализационная, тепловые сети, два трубопровода холодной воды.

Прочее имущество согласно перечню основных средств СОАО «Речицапиво» на 01.05.2017 г.: озеленение 1 ед., машины и оборудование 306 ед., транспортные средства 2 ед., инвентарь и принадлежности 3 ед. *(С полным перечнем имущества, выставляемого на торги, можно ознакомиться у организатора торгов по адресу: г. Гомель, ул. Артема, 23 или у собственника имущества по адресу: г. Речица, ул. Молодежная, 3А).*

***Земельный участок*** *для обслуживания зданий на праве постоянного пользования площадью* ***10,2663 га*** *с кадастровым номером 324550100001004204. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством.*

**Начальная цена: 3 727 846,97 рублей,** в т.ч. НДС по ставке 20%.

**Задаток: 74 556,94 рублей,** в т. ч. НДС по ставке 20%.

**Шаг аукциона – 5%.** Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 4 августа 2017 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **7 августа 2017 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) — паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **с**огласно извещению в газете «Звязда» от 26 июля 2017 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объектов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 0,2 процента от окончательной цены продажи Объектов; в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объектов, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за Объекты, такая оплата должна быть произведена в течение 90 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Извещение о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту было опубликовано в газете «Звязда» от 30.05.2017 г. №100.

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. • 8 (0232) 32-46-47; 32-00-76 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by**

**Продавец: СОАО «Речицапиво», Гомельская обл., г. Речица, ул. Молодежная, 3А. • 8 (02340) 6-39-11; (029) 374-30-21**

# ФІЗКУЛЬТ-УРА!

## Ці хапае сёння спартыўных баз у глыбінках?

**З такім пытаннем мы звярнуліся да людзей, якія непасрэдна звязаны са спартыўнай сферай.**

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Валянціна КУРСЕВІЧ:**

— Я адкажу па сваёй выбарчай акрузе — у мяне Мінскі раён, куды ўваходзяць Бараўляны, Заслаўе, Астрашыцкі Гарадок... Цяпер ідзе абмеркаванне плана генеральнай забудовы пасёлка Лясное і Бараўлян. І ў ім прадугледжана будаўніцтва стадыёна, каб далучаць насельніцтва да розных відаў спорту. Дарэчы, па даных статыстыкі, кожны пяты беларус сёння займаецца спортам. На мой погляд, гэта добра, але ўсё ж недастаткова. Мы за тое, каб людзі вялі здаровы лад жыцця — і не толькі ў гарадах, але і ў глыбінках. Акрамя таго, калі ёсць патрэба, калі попыт нараджае прапанову, то базы ў глыбінках трэба рамантаваць і прыводзіць у парадак, але да гэтага патрэбны рацыянальны падыход. Вядома, такія збудаванні неабходны моладзі. Сёння ў многіх дзяцей з ранняга ўзросту дыягнастуюць і блізарукасць — таму што сядзяць за гаджэтамі і планшэтамі, і скаліёз. Здаровая нацыя — наша галоўнае багацце.

**Абаронца футбольнага клуба «Мінск» Ілья ЛУКАШЭВІЧ:**

— Я лічу, што спартыўных баз па краіне не так ужо і шмат, а тым больш — у глыбінках: там іх увогуле мала. А вось каля Мінска і непасрэдна ў самім Мінску такіх баз дастаткова. Што датычыцца стану, то ў цэлым ён нядрэнны — 6—7 балаў з 10, але ў параўнанні з еўрапейскімі базамі і некаторымі расійскімі — гэта як параўноўваць зямлю і паветра, так што рамонт патрэбны. Я скажу так: проста ў нас усё выглядае вельмі непрыгожа і па-старому. Раздзявальні, душавыя, масажныя кабінеты, нумары, дзе жывуць футбалісты, — у Еўропе відаць, што ўкладзеныя вялікія грошы, і будавалі гэта людзі, якія нешта разумеюць у спартыўнай сферы. Калі паспрабаваць параўнаць, то ў нас у Мінску каля нашага клуба пабудавалі акадэмію футбола — вось там проста выдатна, там ёсць усё для спартсменаў: нумары, сталовыя, трэнажорныя залы, басейны, сауны, залы для тэарэтычных заняткаў. Калі гаварыць менавіта пра футбольныя базы, то па прыклад далёка хадзіць не трэба — акадэмія расійскага футбольнага клуба «Краснадар» проста неймаверная.

**Начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Івацэвіцкага раённага выканаўчага камітэта Ігар КУІС:**

— Спартыўных аб'ектаў у нас менавіта па раёне хапае. Мы стараемся адкрываць філіялы спартыўных баз па ўсім раёне, каб як мага больш людзей мелі магчымасць займацца спортам. Я б ахарактарызаваў стан такіх аб'ектаў як здавальняючы. Чаму? Таму што няма мяжы дасканаласці. Гэта значыць на тым узроўні, што ёсць цяпер, можна праводзіць разнастайныя віды спаборніцтваў. Скажу больш: да нас у раён, у глыбінку, прыязджаюць спецыялісты з вялікіх гарадоў. Тут добры калектыў у самым росквіце сіл. Можа быць, гэтым і пашанцавала. Бо мы ўсе разумеем, што такое маладому спецыялісту прыехаць у маленькі гарадок пасля інстытута.

**Лёгкаатлет Валерый СЫСАЎ:**

— Спартыўных баз вельмі мала, і амаль усе яны — у не вельмі добрым стане. У рэгіёнах базы ёсць толькі ў абласных цэнтрах. Нават калі браць Мінск, то спартыўная школа «Юнацтва» трэніравалася на школьным стадыёне. Што датычыцца рамонту і будаўніцтва, то, на мой погляд, нам неабходна і адно, і другое. У тым сэнсе, што трэба аднаўляць і рамантаваць старыя базы, а таксама будаваць новыя. Я лічу, што ёсць нават небяспечныя месцы, якія рэальна лепш зносіць, а той жа Рэспубліканскі цэнтр Алімпійскай падрыхтоўкі па лёгкай атлетыцы лепш адрамантаваць. Я не магу сказаць, як у іншых месцах, паколькі там, дзе я выступаў, стадыёны і манежы былі новыя і падрыхтаваныя спецыяльна для спаборніцтваў. У нас шмат хакейных арэн, пры гэтым яны не танныя ў абслугоўванні, а вось пляцовак для іншых відаў спорту ў нас няшмат.

**Начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Віцебскага раённага выканаўчага камітэта Вольга РАЗАНАВА:**

— Спартыўных баз у нас хапае. Па стане — калі нашы спартыўныя збудаванні займаюць першыя месцы ў абласных конкурсах, то я думаю, што ён някепскі. Ці трэба рабіць рамонты? Дзе неабходна, мы праводзім патрэбныя працэдуры. Наогул, у нас практычна ў кожным населеным пункце раёна ёсць гульнявая або спартыўная пляцоўка, а там, дзе знаходзяцца школы альбо буйныя прадпрыемствы, ёсць добрыя аздараўленчыя комплексы. Калі гэта глыбінка, то гэта, хутчэй за ўсё, малаперспектыўны населены пункт, гэта значыць жыхароў зусім мала. Дарэчы, у нас і для пенсіянераў створаны спартыўныя цэнтры.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

## Залаў шмат, басейнаў мала

Пра тое што заняткі спортам становяцца ўсё больш папулярнымі і моднымі, можна судзіць нават не паводле статыстычных звестак, а проста азірнуўшыся вакол. Колькасць людзей на веласіпедах, на прабежцы, аматараў, якія займаюцца на спецыялізаваных спартыўных пляцоўках, расце. Гэта датычыцца любога горада, населенага пункта або пасёлка Беларусі.

Параўноўваць рэгіёны і вобласці на прадмет «найбольшай спартыўнасці», напэўна, некарэктна, бо ўсе часткі краіны маюць розныя магчымасці і рэсурсы. А калі гаварыць аб аказанні паслуг у гэтай галіне, то ва ўсіх рэгіёнах яны практычна аднолькавыя. Пра гэта кажа **намеснік начальніка ўпраўлення фізічнай культуры Міністэрства спорту і турызму краіны Васіль КАСАЧ.**

— Усе віды спартыўных паслуг, напрамкаў заняткаў фізкультурай — і новых, і ўжо традыцыйных — ёсць ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны. Аб фізічнай актыўнасці жыхароў Беларусі можна меркаваць яшчэ і па загружанасці спартыўных аб'ектаў, там мы маем добрыя лічбы.

Па гэтым паказчыку сёння лідзіруе Брэсцкая вобласць — 97% у актыве. Сакрэт у тым, што гэты рэгіён краіны мае даволі шмат спартзбудаванняў, у большасці сваёй сучасных. Крыху адстае ад усіх Мінская вобласць, яе паказчык каля 75—80%, што ў прынцыпе таксама нядрэнна. Спецыяліст Мінспорту адзначае, што ў цэлым у напрамку загрузкі і эфектыўнага выкарыстання спартыўных аб'ектаў вядзецца добрая аб'ёмная работа. Спецыяльна для яе кантролю і маніторынгу створана рэспубліканская камісія. Тут кіраўнікам спартзбудаванняў рэкамендавана не толькі звярнуць асаблівую ўвагу на рэкламу паслуг, якія аказваюць палацы, залы, басейны, адкрытыя пляцоўкі, але нават на такія дробязі, як дарожныя паказальнікі. Напрыклад, не лішнія яны будуць на ўездзе ў горад, не столькі для мясцовых жыхароў, колькі для турыстаў, якія ўсё часцей прыязджаюць у Беларусь.

Трэба адзначыць, што рэгіянальныя спецыялісты ў сферы фізкультуры сталі актыўна вывучаць новыя напрамкі, бо канкурэнцыя становіцца ўсё больш жорсткай. Ну і, вядома, не варта забываць, што

Фота БЕЛТА.

**Новы фізкультурна-аздараўленчы цэнтр у Касцюковічах карыстаецца папулярнасцю.**

львіная доля часу работы спартыўных збудаванняў усё ж адведзена пад вучэбна-трэніровачны працэс прафесійных спартсменаў і дзіцячых секцый.

Цікава даведацца меркаванне спецыяліста Міністэрства спорту аб крытыцы з нагоды вялікай колькасці лядовых палацаў і нерацыянальна выдаткаваных на іх грошай (сёння ў краіне 35 спартзбудаванняў са штучным лёдам).

— Аб'ектаў у нас дастатковая колькасць, і яны ўсе запатрабаваныя, няма такіх збудаванняў, якія стаяць нікому не патрэбныя. Акрамя таго, што аказваюцца платныя паслугі насельніцтву, і яны, трэба сказаць, даступныя абсалютна ўсім. Значная частка часу ідзе на дзіцячы спорт, а гэта наша будучыня, бо здароўе закладваецца з малых гадоў. Таму гаварыць пра тое, што аб'екты пабудаваны дарма, не абгрунтавана, — дзеліцца сваім поглядам Васіль Касач.

### Лічбы

**Агульная плошча спартыўных зал у краіне складае 1 667 519 квадратных метраў, з іх у сельскіх населеных пунктах — 656 933 квадратныя метры.**

**Колькасць клубаў па фізічнай культуры і спорце складае 4 623, з іх у сельскіх населеных пунктах 1666.**

**У краіне 27 814 работнікаў фізічнай культуры, з іх 40% — жанчыны.**

**** Даныя 2016 года.***

Сёння ў краіне 23 тысячы 167 спартыўных аб'ектаў (з іх у сельскіх населеных пунктах 8 тысяч 275), больш за ўсё плоскасных збудаванняў (больш за 8 тысяч — гэта пляцоўкі для спартыўных гульняў, палі з газонамі, міні-басейны), менш за ўсё яхт-клубаў — толькі два. Калі дэфіцыт апошніх не такі прыкметны, таму што парусны спорт не настолькі папулярны і масавы ў Беларусі, то вось, напрыклад, недахоп басейнаў (іх у нашай краіне ўсяго 958, і толькі 172 — у сельскіх населеных пунктах) адчувальны.

— Як правіла, менавіта басейны найбольш папулярныя ў насельніцтва, таму занятыя звычайна з 6.00 да 23.00. Кіраўніцтва спартыўнай галіны ў курсе гэтай праблемы і ўсяляк спрабуе яе вырашаць — шляхам уводу новых аб'ектаў і рэканструкцыі ўжо існуючых, — адзначае Васіль Фёдаравіч.

## Людзі хочуць бегаць

Немалаважным фактарам прыцягнення насельніцтва да заняткаў фізічнай культурай з'яўляецца правядзенне культурна-масавых спартыўных мерапрыемстваў. На працягу года па краіне іх адбываецца каля 20 тысяч.

Самыя маштабныя праходзяць у сталіцы — Мінскі паўмарафон, забегі, прымеркаваныя да свят, памятных дат або велапрабегі. Аднак свае, традыцыйныя, характэрныя для канкрэтнага рэгіёна мерапрыемствы, адбываюцца і ў абласных цэнтрах. Так, ужо 30-ы раз адбудзецца фестываль бегу «Языльская дзясятка» ў Старых Дарогах, традыцыйным стаў экалагічны забег у Гомельскай вобласці, дабрачынны маладзёжны велапрабег «Будзьма — за здаровую Беларусь!» у Гомелі, турнір па пляжным валейболе «Мяч над сеткай» у Магілёве. У гэтым плане задзейнічаны ўсе рэгіёны. Цяпер на такую работу робіцца акцэнт і міністрам спорту і турызму Аляксандрам Шамко.

— Няхай такіх мерапрыемстваў будзе не шмат, але хаця б 2—3 з іх — маштабныя і знакавыя, аналагаў іх няма ў краіне, — лічыць Васіль Касач. — Сёння людзі самі з задавальненнем прымаюць у іх удзел. Узяць, напрыклад, той жа жаночы забег на 8 Сакавіка, прыходзілася нават спыняць рэгістрацыю, таму што ахвотных было больш, чым магчыма прыняць на трасе. Мы ўсё гэта бачым і ўлічваем у арганізацыі на будучыню. Сёння людзі клапоцяцца пра сваё здароўе, нават сярод моладзі быць спартыўным — модна. Пакуль у рэгіёнаў ёсць праблемы з наяўнасцю спартыўнага інвентару, правядзеннем яркіх, крэатыўных мерапрыемстваў. Мабыць, так адбываецца з-за таго, што магчымасцяў там менш.

Штогод расце колькасць буйных міжнародных спартыўных спаборніцтваў, якія праводзяцца ў Беларусі (30 — у 2015 годзе, 67 — у 2016-м, па плане на 2017 год — больш за 80), усё часцей іх правядзенне давяраюць рэгіёнам.

## Фізкультура — у аснове прафесійнага спорту

Спартыўныя поспехі на міжнародных арэнах не магчымыя без актыўнай масавасці ў занятках фізічнай культурай. Менавіта яна ляжыць у аснове прафесійнага спорту. Як правіла, адораных дзяцей знаходзяць на школьных занятках або ў дзіцячых секцыях, і ўжо адтуль яны пачынаюць свой шлях у вялікі спорт. Ці складана прыцягнуць да заняткаў дзяцей з глыбінак? Пытанне спрэчнае. З аднаго боку, яны наадварот больш цягнуцца да спорту, бо маюць менш магчымасцяў заняць свой вольны час. Спецыялісты адзначаюць, што дзяцей з вёсак ці гарадскіх пасёлкаў хутчэй і прасцей набраць у групы для заняткаў у спартыўнай секцыі, чым у буйным горадзе. Аднак тут можна сутыкнуцца з іншай праблемай — трапіць на трэніроўкі ў горад дзецям з сяла праблематычна, а спартыўных секцый у вёсках не так шмат.

Сёння ў краіне культывуецца 132 віды спорту, а беларускія атлеты ўдзельнічаюць у самых прэстыжных спаборніцтвах планеты — Алімпійскіх гульнях — з 1952 года. Самастойнай камандай нашы спартсмены пачалі выступаць з 1994-га, за гэты час прадстаўнікамі суверэннай Беларусі заваявана 100 алімпійскіх медалёў, 19 з іх — залатыя ўзнагароды. Трэба адзначыць, што алімпійскімі чэмпіёнамі сталі толькі 5 прадстаўнікоў сталіцы — Дар'я Домрачава (біятлон), Вадзім Махнёў (веславанне), Аляксей Грышын (фрыстайл), Вікторыя Азаранка і Максім Мірны (тэніс). Такая статыстыка дае яснае ўяўленне пра тое, наколькі важкі ўклад уносяць спартсмены рэгіёнаў у алімпійскую славу Беларусі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)***

### Да тэмы:

**Найбольш вядомыя беларускія спартсмены, якія нарадзіліся ў розных рэгіёнах краіны:**

**Андрэй Арамнаў —** алімпійскі чэмпіён Пекіна-2008, цяжкая атлетыка (нарадзіўся ў Барысаве, Мінская вобласць);

**Андрэй і Аляксандр Багдановічы —** алімпійскія чэмпіёны Пекіна-2008, сярэбраныя прызёры Алімпіяды ў Лондане 2012 года, веславанне (нарадзіліся ў пасёлку Ялізаве, Магілёўская вобласць);

**Святлана Баітава —** алімпійская чэмпіёнка Сеула-1988, спартыўная гімнастыка (нарадзілася ў горадзе Магілёве);

**Андрэй Барбашынскі —** алімпійскі чэмпіён Барселоны-1992 у складзе каманды СНД па гандболе (нарадзіўся ў горадзе Ашмянах, Гродзенская вобласць);

**Уладзіслаў Ганчароў —** алімпійскі чэмпіён Бразіліі-2016, скачкі на батуце (нарадзіўся ў горадзе Віцебску);

**Сяргей Каплякоў —** двухкратны Алімпійскі чэмпіён па плаванні Масквы-1980, сярэбраны прызёр у Манрэалі-1976. Першы плывец у свеце, які пераадолеў дыстанцыю 200 м хутчэй за 1 хвіліну 50 секундаў (нарадзіўся ў горадзе Оршы, Віцебская вобласць);

**Яніна Карольчык —** алімпійская чэмпіёнка Сіднея-2000, штурханне ядра (нарадзілася ў вёсцы Хрышчановічах, Гродзенская вобласць);

**Кацярына Карстэн —** двухкратная алімпійская чэмпіёнка (Атланта-1996, Сідней-2000), сярэбраны прызёр Алімпіяды ў Афінах, бронзавы прызёр Алімпіяды ў Барселоне, веславанне. Удзельніца сямі Алімпійскіх гульняў. Першая двухкратная алімпійская чэмпіёнка ў гісторыі незалежнай Беларусі (нарадзілася ў вёсцы Асечане, Мінская вобласць);

**Марына Лобач —** алімпійская чэмпіёнка Сеула-1988, мастацкая гімнастыка (нарадзілася ў горадзе Смалявічах, Мінская вобласць);

**Аксана Мянькова —** алімпійская чэмпіёнка Пекіна-2008, кіданне молата (нарадзілася ў горадзе Крычаве, Магілёўская вобласць);

**Юлія Несцярэнка —** алімпійская чэмпіёнка ў бегу на 100 метраў, Афіны-2004 (нарадзілася ў горадзе Брэсце).

# БАБРУЙСКІ ФЕНОМЕН

## Чэмпіёны па веславанні тут растуць не «дзякуючы», а «насуперак»...

**Пра заслугі бабруйскіх весляроў ведаюць нават тыя, хто далёкі ад гэтага віду спорту. Дастаткова нагадаць толькі некалькі прозвішчаў: Віктар Рэнейскі, Андрэй і Аляксандр Багдановічы, Дзяніс Махлай, Надзея Макарчанка... Бабруйская школа веславання — адна з наймацнейшых у Беларусі. На нядаўнім чэмпіянаце Еўропы, які праходзіў у балгарскім Плоўдзіве, бабруйскія выхаванцы Андрэй Багдановіч і Дзяніс Махлай заваявалі «срэбра». А перад гэтым віншавалі з «золатам» і «бронзай» Надзею Макарчанку, якая пераможна выступіла са сваёй напарніцай. Парадокс толькі ў тым, што ўся гэтая зорная плеяда вырасла ў Бабруйску не дзякуючы, а насуперак усім канонам вяслярнага спорту.**

### База спатыкнення

